

У ГОСЦІ ДА МАНЮШКІ **8**



ГІСТОРЫЯ АДНОЙ КАРЦІНЫ **12**

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на родным мове

# ЗВЯЗДА

9 КРАСАВІКА 2019 г. АЎТОРАК № 66 (28933)

**ЦЫТАТА ДНЯ**



**Андрэй ГАЕЎ, старшыня Дзяржаўнага камітэта па маёмасці:**

*«Садаводчыя таварыствы ствараліся ў нас масава ў 80-х гадах, і многія нарматывы, уласцівыя населеным пунктам, там не выконваюцца — ні шырыня праездаў, ні пытанні, звязаныя з водазабеспячэннем і іншае. Таму пры наданні статусу жылога дома садоваму доміку ўзнікае пытанне: а чым гэтая тэрыторыя адрозніваецца ад населенага пункта? Тады неабходна забяспечыць усе сацыяльныя гарантыі, уласцівыя населенаму пункту. Не выключана, што будзе знойдзена магчымасць рэгістрацыі ў садовых доміках, хоць пакуль пра гэта казаць яшчэ рана».*

# «СВЕТЛЫ ШЛЯХ». ВЯСНА. СЯЎБА



«Вясенні дзень год корміць» — гэта народная мудрасць вядома Сяргею Карашчуку не па чутках. Кожную вясну на працягу амаль трыццаці гадоў механізатар ААТ «Светлы шлях Агра» Чавускага раёна прымае актыўны ўдзел у пасяўной. Сёлетняя — не выключэнне. З самага ранку трактарыст ужо ў полі. На энерганасычаным трактары з сеялкай, у бункеры якой засыпана яравая пшаніца, механізатар у дзень здымкі засяваў поле плошчай у 80 гектараў.

— Зараз кожная хвіліна на кошт золата, — расказвае Сяргей Карашчук, з любоўю перасыпаючы ў далонях зямлю. — Вясна сёлета ранняя, і вільгаць вельмі хутка пакідае глебу. А каб зерне прарасло і набралася моцы, трэба шмат спрыяльных умоў, адна з якіх — пэўная вільготнасць глебы.

З гэтай прычыны і працуе механізатар не гледзячы, які час на гадзінніку.

— З ранку і, бывае, да ночы, пры святле фар працуем, каб паспець. А што зробіш, на тое яна і вясна. Узімку адпачылі, зараз пара і папрацаваць, — усміхаецца суразмоўнік.

Не марнуючы час на размовы, Сяргей спяшаецца да трактара, бо зямля чакае...

**Андрэй САЗОНАЎ, фота аўтара.**

**КОРАТКА**

- Аператар velcom афіцыйна абвясціў пра рэбрэндынг. Кампанія будзе называцца velcom A1, у будучыні — A1.
- **Фінал XXVI Рэспубліканскага чэмпіяната па інтэлектуальных гульнях сярод школьнікаў пройдзе 13—14 красавіка ў Мінску.**
- У Дрыбінскім раёне ў вёсцы Белая падчас пажару прыватнага дома 23-гадовы сяржант міліцыі Антон Сямякін выратаваў гаспадара.
- **У Брэсцкай вобласці з канца лютага зарэгістравана 258 пажараў сухой расліннасці і кустоў.**
- Дзевяць крымінальных спраў заведзена на жыхара Гродна за махінацыі з машынай.

ISSN 1990 - 763X

# ЭНЕРГІЯ БУДУЧЫНІ

**Амаль палову неабходных электрычнасці і цяпла мы можам атрымліваць з невычэрпных крыніц**



Фота БелТА.

**Апошнія дзесяцігоддзі адзначыліся ў свеце бурным ростам вытворчасці энергіі, атрыманай з аднаўляльных крыніц. Сонца, вецер, вада, вулканічная магма, нават распаленае ядро Зямлі ўсё больш трывала становяцца на службу чалавеку. У некаторых развітых краінах доля электрычнасці і цяпла, здабытых пры дапамозе невычэрпных прыродных рэсурсаў, перавысіла 30 працэнтаў. І гэта не мяжа. Па разліках вучоных і спецыялістаў, праз пару дзясяткаў гадоў прыведзеная лічба павінна падвоіцца. Прычым яна будзе адлюстроўваць ужо не дасягненні асобных дзяржаў, а сярэдні планетарны паказчык.**

СТАР. 4

Ведай нашых!

# НАЙЛЕПШЫЯ З НАЙЛЕПШЫХ

## Узрост для перамогі на алімпіядзе — не перашкода

**Больш як 1,5 тысячы навучэнцаў з усіх рэгіёнаў краіны прынялі ўдзел у заключным туры рэспубліканскіх школьных алімпіяд па 18 вучэбных прадметах. Раней пералік алімпіядных дысцыплін папоўніла кітайская мова, а сёлета ўпершыню прайшла алімпіяда па прадмеце «Фізічная культура і здароўе».**

**Інтэлектуальныя спаборніцтвы прымалі на вясенніх школьных канікулах Ліда, Барысаў, Магілёў, Орша, Жлобін, Полацк, Баранавічы, Пінск, Віцебск, Гомель і Маладзечна.**

### Каму скарыўся п'едэстал?

Як адзначыла **кансультант упраўлення агульнай сярэдняй адукацыі Міністэрства адукацыі Анжэла КУДАЯРАВА**, ва ўсіх турах прадметных алімпіяд — ад школьнага да рэспубліканскага — свае веды прадэманстравала сёлета каля 600 тысяч юнакоў і дзяўчат. На першым і другім этапах (школьным і раённым) вучням даецца магчымасць выступаць па некалькіх вучэбных прадметах. Але на трэцім (абласным, мінскім гарадскім) і рэспубліканскім этапах навучэнец павінен выбраць адзін вучэбны прадмет.

СТАР. 5

# БЕЛАРУСІ ПАТРЭБНЫ МІР НА ЗАХАДЗЕ І УСХОДЗЕ

## Учора Прэзідэнт даў інтэрв'ю турэцкаму інфармацыйнаму агенцтву «Анадолу»

**Размову з беларускім лідарам вёў кіраўнік маскоўскага карэспандэнцкага пункта турэцкага інфармацыйнага агенцтва «Анадолу» Алі Джура. Гутарка доўжылася больш за 40 хвілін, за гэты час кіраўнік дзяржавы адказаў на дзясятак пытанняў на самыя розныя тэмы — ад сітуацыі ў беларуска-турэцкіх адносінах да выбараў ва Украіне. Пакуль мы можам прывесці толькі фрагменты інтэрв'ю, больш поўная версія з'явіцца крыху пазней.**

### Калі канфлікты запальваюць — значыць — гэта каму-небудзь трэба?

Напрыклад, журналіст адзначыў, што сёння людзі становяцца сведкамі нарастання крызісных з'яў ва ўсім свеце, яны адчуваюць сур'ёзныя турботы за мір на Зямлі. «Як гэта ўплывае на замежную палітыку Рэспублікі Беларусь? Якіх мэт ваша краіна імкнецца дасягнуць на міжнароднай арэне?» — пацікавіўся журналіст у Аляксандра Лукашэнкі.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што, сапраўды, канфлікты ў гэтым свеце ўспыхваюць у розных месцах. «Сёння створана напружанне зусім побач, каля нашых межаў, ва Украіне. У Венесуэле вы ведаеце, што адбываецца. Дай бог, каб гэта не перарасло ў нейкі міжнародны канфлікт і сутыкненне, — сказаў беларускі лідар. — Вы бачыце, што адбываецца ў Лівіі, — і гэта толькі пачатак. Вы бачыце і адчуваеце ўжо як грамадзянін Турцыі, што адбываецца побач з вамі ў Сірыі, Іраку. Курдскае пытанне, курдская праблема для вас вельмі важная».

Прэзідэнт падкрэсліў: калі канфлікты ўзнікаюць, значыць, яны камусьці патрэбныя. «І гэты тэзіс пацвярджае тое, што гэтыя канфлікты ўзнікаюць у краінах з багатымі прыроднымі рэсурсамі. У краінах, якія займаюць найважнейшае геапалітычнае становішча на карце свету. Адказ зразумелы — значыць, камусьці патрэбныя гэтыя рэсурсы, значыць, хто-небудзь хоча ўплываць на тыя дзяржавы, якія займаюць гэтае геаграфічна і стратэгічна важнае становішча», — падкрэсліў ён.

Аляксандр Лукашэнка задаўся пытаннем: ці трэба гэта беларусам? «Не. Не, нават калі мы вельмі зацікаўлены як дзяржава ў прыродных выкапнях, у рэсурсах, — у нас іх не хапае, асабліва вуглевадародных. Мы ў гэтым не зацікаўлены, таму што мы не з'яўляемся глабальным гульцом і не маем імперскай псіхалогіі, каб сілай уплываць на тую ці іншую дзяржаву і займець гэтыя рэсурсы», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

Дык каму ж усё-такі выгадныя канфлікты? «Усё гарыць ад галоўных сусветных гульцоў, — растлумачыў ён. — Што гэта за гульцы? Вы іх добра ведаеце. Адны сябе паводзяць агрэсіўна, іншыя займаюцца рыторыкай, вельмі шмат крычаць, але тым не менш падліваюць масла ў агонь. Трэція маўкліва стараюцца ўплываць на сітуацыю ў свеце. Але кожны з гэтых гіганцкіх гульцоў мае пэўную мэту, перш за ўсё вось гэтую мэту — падзяляй і ўладар».

Беларусь жа, падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, у гэтым катэгарычна не зацікаўлена. «Турцыя, мне здаецца, таксама не прыхільніца таго, каб усюды ўспыхвалі вось гэтыя ачагі канфлікту. Таму што Турцыя ў такім становішчы, што гэта можа дрэнна для яе самой скончыцца, калі яна будзе распальваць канфлікты», — дадаў Прэзідэнт.

Пры гэтым ён звярнуў увагу, што турэцкія ўлады робяць усё, каб аслабіць сітуацыю каля сваіх межаў і на Блізкім Усходзе ў цэлым. Такім чынам, ні Турцыі, ні Беларусі такія канфлікты — лакальныя ці больш буйныя — абсалютна не патрэбныя, упэўнены кіраўнік дзяржавы. «Мы тут нічога не выйграем — па-першае. А па-другое, наш менталітэт іншы. Мы наеліся гэтых войнаў», — нагадаў ён.

Таму Беларусь праводзіць збалансаваную шматвектарную палітыку. «Нам трэба, каб быў мір і на Захадзе, і на Усходзе. Мы ад гэтага толькі выйграем, займаючы хай нават складанае геаграфічнае становішча ў гэтым свеце паміж магутным Захадам і магутным Усходам, дзе размешчаны вялікая Расія і вялікі Кітай, а з другога боку — Еўрапейскі саюз. Вось наша пазіцыя — яна паходзіць выключна ад жыцця, яна паходзіць з таго становішча, у якім знаходзіцца сёння Беларусь. І нам не патрэбныя канфлікты не толькі ў Сірыі — далёка, быццам бы, ад нашых межаў. Яны тым больш не патрэбныя тут, каля нашых межаў. Я маю на ўвазе Украіну. Таму мы займаем тут прынцыповую пазіцыю. Сёння гэты пажар за некалькі кіламетраў ад цябе, а заўтра ён перакінецца на тваю тэрыторыю. І тады ўжо будзе горача», — сказаў беларускі лідар.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

❍ А хто пераможа?

### Прагноз беларускага лідара па прэзідэнцкіх выбарах ва Украіне

Яшчэ Аляксандр Лукашэнка і журналіст Алі Джура абмеркавалі сітуацыю ва Украіне, а таксама шляхі яе ўрэгулявання. Беларускі лідар ацаніў перагаворы паміж бакамі, а таксама расказаў пра перспектывы ўдзелу нашай краіны ў вырашэнні сітуацыі.

Вядома, закранулі і прэзідэнцкія выбары ў гэтай краіне. Яшчэ падчас «Вялікай размовы з Прэзідэнтам» Аляксандр Лукашэнка спрагназаваў перамогу Пятра Парашэнкі. Ці змянілася яго пазіцыя цяпер?

«Пасля першага тура лідзіруе Зяленскі, Парашэнка ад яго адстае. Як скончыцца другі тур, ніхто не адважыцца прадказаць, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Я ўсё ж такі схільны думаць, што гэтыя прэзідэнцкія выбары выйграе Парашэнка. Я не буду тут займацца нейкай аналітыкай, не буду параўноўваць аднаго з другім, таму што аднаго я вельмі добра ведаю, другога я наогул бачыў толькі ў кіно, я яго як палітыка не ведаю».

Беларускі лідар расказаў, што ў яго і ў Прэзідэнта Украіны Пятра Парашэнкі быў агульны сябар — Міхаіл Саакашвілі. «Калі Саакашвілі праводзіў выбары, будучы Прэзідэнтам, канстытуцыю памянялі, яшчэ нешта — пачалі жартамі займацца з народам. Да чаго гэта прывяло? Гэта прывяло да таго, што яму давялося пакінуць Грузію і хавацца ў іншых краінах», — нагадаў ён.

«Каб Парашэнку не давялося залазіць на дах і з даху там заклікаць украінцаў абараніць яго, ён зробіць усё, каб украінцы яго падтрымалі. Ён павінен зрабіць усё, каб яго народ падтрымаў», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Сёння ва Украіне ёсць меркаванне, што галасаваць фактычна няма за каго, таму за Уладзіміра Зяленскага свае галасы аддаюць у якасці пратэсту. Што рабіць у такой сітуацыі? Кіраўнік дзяржавы расказаў:

«Няхай мне прабачаць украінцы, але я хачу ім сказаць: калі няма за каго галасаваць, то і галасаваць не трэба. Навошта галасаваць за чалавека, у якім ты не ўпэўнены, бо ўкраінцы такі цяжкі палітычны шлях прайшлі за апошнія гады. Яны ўжо наеліся вось гэтых незразумелых абяцанняў, яны, шмат разоў рызыкуючы, верылі палітыкам і іх падтрымлівалі, — і ўвесь час атрымлівалася наадварот. Апошнія гады вопыт украінскага народа — сведчанне таго, што нельга рызыкаваць. Значыць, трэба ісці на паўторныя выбары. Калі ўжо не атрымліваецца, калі няма за каго галасаваць, — значыць, паўторныя выбары. Мне здаецца, гэта лепш, чым чарговы раз рызыкнуць, прагаласаваць, а потым горка каяцца дзесяць ці больш гадоў».

Блізкая ўлада

# ЭКАНОМІКА, БЯЗВІЗ І ПРАБЛЕМЫ БУДАЎНІЧАЙ ГАЛІНЫ

**Уладзімір КРАЎЦОЎ адказаў на пытанні журналістаў падчас чарговай прэс-канферэнцыі, якая прайшла ў Іўі**



Фота БелТА.

### ХТО ДБАЕ, ТОЙ І МАЕ

Жыццё не стаіць на месцы, і многія эканамічныя паказчыкі таксама змяняюцца. Як адзначыў старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Краўцоў, за першы квартал ужо можна сказаць, што ёсць чысты прыбытак у эканоміцы. Адзінае, што непакоіць, — гэта стратныя прадпрыемствы, іх нямала — 25 % ад агульнай колькасці. Таму зараз вядзецца аналіз іх дзейнасці.

Напрыклад, летась 450 мільёнаў рублёў страт атрымала АЭС. Здавалася б, чаму, яна ж яшчэ не запушчана? Але гэта страты будаўнічых работ за кошт курса валют. Таму ўлады будуць разбірацца і пры неабходнасці ўмешвацца.

Разам з тым вобласць захавала станоўчую дынаміку ў эканоміцы. Валавы рэгіянальны прадукт у мінулым годзе склаў 104 % — самы высокі паказчык у краіне. Варта адзначыць і рост экспарту. З пачатку года ён склаў 124 %. Гэта не выпадковы рост, адзначыў кіраўнік рэгіёна, а планамерная работа па выхадзе на знешнія рынкі.

Важны паказчык дзейнасці прадпрыемстваў — заработная плата. Яна фарміруецца зыходзячы з выпуску і продажу прадукцыі. Такім чынам, у снежні мінулага года рэгіён дасягнуў узроўню зарплаты ў 943 рублі. У першым квартале, як правіла, заробкі ніжэйшыя, і зараз яны па рэгіёне складаюць 835 рублёў. Але відаць дынаміка росту, бо гэты паказчык вышэйшы за леташні на 108 %, што дазволіць выйсці на прагнозныя паказчыкі. Зарплату ў 1 тысячу рублёў дасягнулі Гродна, Гродзенскі і Астравецкі раёны.

### ІНВЕСТАРЫ ПРЫХОДЗЯЦЬ

З сёлетніх праектаў — завод па выпуску лекавых прэпаратаў у Скідзелі, які рэалізаваны сумесна з індыйскай кампаніяй. Зараз там ідуць працэсы па сертыфікацыі медпрэпаратаў для ўнутранага і знешняга рынкаў, у прыватнасці расійскага. Толькі ў гэтым годзе плануецца прадаць туды прадукцыі на 40—50 мільёнаў долараў. З ліку буйных праектаў — будаўніцтва АЭС, дзе поўным ходам вядуцца мантажныя работы. Як вядома, пуск першага энергаблока павінен адбыцца ў канцы гэтага года. А другога — у канцы 2020-га.

У жніўні пачне дзейнічаць яшчэ адзін буйны завод па выпуску фанеры ў Смаргоні. Праект аўстрыйскай кампаніі «Кранаспан», якая развівае свае магутнасці ў Гродзенскім раёне, у Свіслацкім будуе лагістычны цэнтр. Дарэчы, у сакавіку ўведзены буйны транспартна-лагістычны цэнтр у Ашмянскім раёне каля міжнароднага пункта пропуску «Каменны Лог». Актыўна будуецца такі цэнтр у пункце пропуску «Бераставіца».

Завершаны праект па выпуску дацкай беконнай свініны ў Слонімскім раёне. Яго магутнасць — 6 тысяч тон жывой вагі штогод. Гэта амаль 50 тысяч галоў, і сёлета прадпрыемства выйшла на праектную магутнасць.

### ШТО ПАСЕЕМ...

Мінулы год быў няўдалы: вобласць недабрала 400 тысяч тон збожжа. І яго трэба было знайсці, каб не страціць пагалоўе. Таму куплялі на біржах, у Расійскай Федэрацыі, бралі крэдыты. Гэта дазволіла захаваць статак. Уладзімір Краўцоў паведаміў, што ў цэлым летась атрымалі значны прыбытак у аграрным сектары — каля 140 мільёнаў рублёў. Гэта даволі значная лічба з улікам праблемнага года.

На сёлетнюю пасяўную забяспечанасць мінеральнымі ўгнаеннямі складае 80 % — гэта самы высокі паказчык у краіне. Ідзе сяўба ранніх культур. У гэтым годзе рэгіён ставіць задачу сабраць 1600 тон зерня.

### БЯЗВІЗ ПАШЫРЫЦЦА?

Абласныя ўлады выйшлі з прапановай аб пашырэнні бязвізавай зоны.

— Мы выказалі намер уключыць туды Шчучынскі, Воранаўскі, Лідскі раёны і павялічыць тэрмін знаходжання турыстаў да аднаго месяца, — адзначыў Уладзімір Краўцоў. — Прапановы знаходзяцца ў стадыі ўзгаднення з рознымі ведамствамі. Гэта дасць дадатковы штуршок у развіцці турызму ў Гродзенскай вобласці.

Між тым работа па рэканструкцыі многіх аб'ектаў вядзецца актыўна. У рамках дзяржаўнай інвестпраграмы ідуць работы ў Старым замку. У 2020 годзе плануецца ўвесці першую чаргу. Сёлета — завяршыць рэканструкцыю другой вежы Лідскага замка і адкрыць яго для турыстаў. Асвойваюцца сродкі прэзідэнцкага фонду на Гальшанскім і Крэўскім замках.

Да 75-годдзя Гродзенскай вобласці ёсць намер увесці палацава-паркавы комплекс «Свяцк». У Іўеўскім раёне былы маёнтак Умястоўскіх — копію палаца ў польскіх Лазенках — выкупіў беларускі інвестар і пачаў яго аднаўляць. У вобласці ёсць іншая маёнткі, якія купілі прыватныя інвестары і робяць турыстычныя аб'екты.

Будзе працягвацца работа па ўшанаванні вядомых асоб старажытнага горада. Непадалёк ад Старога і Новага замкаў нядаўна з'явіўся помнік Давыду Гарадзенскаму — гарадскому старасту. Да Дня пісьменства ў Слоніме будзе ўстаноўлены помнік Льву Сапегу, у Дзятлаве будзе ўвекавечана асоба Канстанціна Астрожскага. Гэтыя ідэі ідуць ад людзей, і ўлады да іх прыслухоўваюцца. На прэс-канферэнцыі прагучала прапанова па стварэнні ў Гродне музея вядомага пісьменніка Васіля Быкава. Матэрыял аб ім існуе ў некалькіх музеях, але ён разрознены. Магчымасць стварэння такога музея будзе разглядацца.

### АПТЫМІЗАЦЫЯ НЕАБХОДНАЯ

Была закранута і тэма канфліктнай сітуацыі, якая склалася на будаўнічым прадпрыемстве «Гроднааблсельбуд». Прадстаўнікі адной з падведамасных структур выказалі пратэст супраць расфарміравання іх арганізацыі. Як растлумачыў кіраўнік рэгіёна, многія праграмы ў сельскіх населеных пунктах завяршыліся і аб'ём будаўніцтва зменшыўся. Прадпрыемствы своечасова на гэта не адрэагавалі, падрадаў няма, а пазыка расце. Таму была створана спецыяльная камісія і прынята праграма аптымізацыі прадпрыемства. Але ў кожным раёне засталіся значныя вытворчыя базы, якія зараз незапатрабаваныя, бо састарэлі. Таму ўсё было пералічана, унесена ў рэестр. У Шчучыне, дзе дзве ПМК, было прынята рашэнне адну ліквідаваць з прапанаваннем рабочых месцаў згодна з кваліфікацыяй з такім жа ўзроўнем заработнай платы. З кожным персанальна будзе весціся гутарка, каб чалавек не аказаўся без працы, падкрэсліў Уладзімір Краўцоў. Дарэчы, працэсы па аптымізацыі адбываюцца і ў іншых раёнах, дзе, па сутнасці, засталіся адны ўпраўленцы.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

Цэны

# Падаражэлі толькі асобныя прадукты

**А ялавічына, магчыма, і патаннее**

**Аб гэтым паведаміла намеснік старшыні Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Алена МАНКЕВІЧ на брыфінгу па выніках прафсаюзнага маніторынгу цэн за першы квартал года.**

Яна адзначыла, што ў першыя месяцы года працягваўся рост цэн і на крупы прасяныя, бульбу, моркву і буракі, што звязана з сезоннасцю, а таксама на ялавічыну і сыры. У прыватнасці, па выніках прафсаюзнага маніторынгу, сыры і ялавічына за квартал падаражэлі на 10 %. Федэрацыя выбарачна правярае 98 найменняў прадуктаў харчавання. Аналіз праводзіцца ў крамах крокавай даступнасці, сетказых, дзяржаўных і недзяржаўных крамах, якія размешчаны ў 137 населеных пунктах ва ўсіх рэгіёнах краіны.

Па выніках 2018 года ў параўнанні з 2017-м рэзкіх скачкоў не было, але на асобныя прадукты харчавання, якія ўваходзяць у набор асноўных, як лічаць у федэрацыі, рост быў усё ж дастаткова істотным. Так, на 12 % выраслі цэны на муку, на 14 % падаражэла бульба, на 17 % — морква, буракі, яйкі, свініна, на 20 % — птушка. Асаблівы непакой прафсаюзаў быў звязаны з ростам цэн на свініну, ялавічыну і курынае мяса, паколькі гэтыя прадукты выкарыстоўваюцца пры гатаванні гарачага харчавання ў школах, садках, сталовых на прадпрыемствах. «Мы паставілі пытанне: што будзе з гарачым харчаваннем? Урад нас пачуў — было дадзена даручэнне шэрагу міністэрстваў, арганізацый, канцэрнаў правесці аналіз і або закласці ў свае бюджэты па гарачым харчаванні больш грошай, або даць больш працэнт патанання. Гэтую праблему нам тады ўдалося адрэгуляваць», — адзначыла Алена Манкевіч.

Асобна намесніца старшыні спынілася на ялавічыне. Прафсаюзы разумеюць, што сёння ёсць праблема з закрыццём шэрагу рынкаў, у тым ліку расійскага. Мы туды сёння не можам пастаўляць ялавічыну на касцы, што звязана з пэўнымі стандартамі ў гэтай краіне. Праблема абмяркоўвалася сумесна з Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю.

Улічваючы, што ялавічына масава накіроўвалася на расійскі рынак, можна дапусціць некалькі сцэнарыяў паводзін цэн на яе. Сітуацыя можа развівацца па двух напрамках. Першы — мы ўбачым рост цэн на ялавічыну. Уладальнікі (прадпрыемствы) гэтага прадукту могуць паспрабаваць такім чынам кампенсаваць страты, якія яны, безумоўна, панясуць, за кошт унутранага рынку. Другім напрамкам стане з'яўленне на нашым рынку вялікай колькасці таннай ялавічыны, калі яе вытворцы вырашаць атрымаць максімальны даход за кошт вялікіх паставак на опт. Які з напрамкаў выберуць самыя буйныя гульцы мяснога рынку, мы даведаемся ўжо ў найбліжэйшы час.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# АЛЕЯ ГЕОЛАГАЎ

**Яе да прафесійнага свята — Дня геолага — пасадзілі ў сталіцы сем'і геолагаў, прадстаўнікі руху «Юны геолаг», работнікі Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя на чале з міністрам Андрэем Худыком. Міністр падкрэсліў, што дадзеная акцыя прымеркаваная і да кампаніі «Добраўпарадкуем малую Радзіму», якая паспяхова рэалізуецца па ўсёй краіне:**





— Гэта падзея дастасоўваецца да тых мерапрыемстваў па навядзенні парадку на зямлі і азеляненні, якія актыўна праводзяцца ў Беларусі, дзеля выканання даручэнняў, якія ставяць перад намі кіраўнік дзяржавы і ўрад. Пасадка такой алеі — добрая і карысная задумка. Дзякуючы ёй мы будзем памятаць пра геолагаў, якія многія гады стваралі мінерально-сыравінную базу для нашай краіны. Яна стала асновай многіх галін: будаўнічай, нафтаперапрацоўчай, шкляной і іншых, — адзначыў Андрэй Худык.

Алена Мікалаеўна Дрозд, географ, біёлаг, палінолаг і актыўная ўдзельніца акцыі, прызналася, што прафесія геолага сёння набыла статус адзінкавай. Прафесіяналаў, якія прайшлі «палявую» школу, у нашай краіне няшмат:

— Мне пашанцавала працаваць з сапраўднымі геолагамі, якія не сядзяць у кабінетах. Я вельмі цаню калектыў, у якім знаходжуся. Гэтае свята для мяне юбілейнае — я ў прафесіі ўжо 15 гадоў.

Удзельнікі акцыі пасадзілі 50 ліп і выказалі надзею, што яна дапаможа не толькі азеляніць сталіцу, але і папулярызаваць запатрабаваную прафесію геолага.

**Вольга ПРАЛЮК, фота аўтара.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Саудаўская Аравія можа адмовіцца ад разлікаў у доларах пры продажы нафты



Кангрэс ЗША рыхтуецца да абмеркавання законапраекта аб прызнанні Арганізацыі краін — экспарцёраў нафты АПЕК картэлем — No Oil Producing and Exporting Cartels (NOPEC) Act, ухваленага ў лютым юрыдычным камітэтам палаты прадстаўнікоў. Ён абвяшчае незаконнымі рашэнні АПЕК, а таксама любыя сумесныя дзеянні ўрадаў іншых краін (акрамя ЗША), накіраваныя на абмежаванне здабычы нафты і рэгуляванне цэн на сыравіну. Амерыканцы распрацавалі NOPEC Act яшчэ ў 2000 годзе, але пры адміністрацыі Барака Абамы ўсе спробы яго прыняць праваліваліся. Прыход у Белы дом Дональда Трампа, апантанага ідэяй зніжэння сусветных цэн на нафту, забяспечыў законапраекту неабходную падтрымку. Між тым, падлічылі аналітыкі, спыненне дзейнасці АПЕК прывядзе да абвалу каціровак, параўнальнаму з тым, што рынак перажыў у 2013—2014 гадах, калі Brent звалілася да 30 долараў за барэль. У сваю чаргу Саудаўская Аравія прыгразіла адмовіцца ад разлікаў у доларах пры продажы нафты. На такі крок каралеўства можа пайсці, калі ў Вашынгтоне прымуць закон аб санкцыях супраць краін АПЕК за картэльную змову. Як заявіў адзін з амерыканскіх чыноўнікаў агенцтву Reuters, калі саўдзіты выканаюць сваю пагрозу, «эканоміка ЗША развалiцца».

## У Эстоніі праходзяць найбуйнейшыя ў свеце вучэнні па кібербяспецы

Найбуйнейшыя ў свеце вучэнні па кібербяспецы Locked Shields 2019 стартавалі ў Эстоніі. Пра гэта паведаміў размешчаны ў Таліне Цэнтр кібераబароны НАТА. Згодна са сцэнарыем вучэнняў, умоўная астраўная дзяржава Берылія напярэдадні выбараў сутыкаецца з пагаршэннем сітуацыі ў сферы бяспекі. Скаардынаваныя кібератакі прыводзяць да збояў у рабоце сістэм ачысткі вады, электрасетак, мабільнай сувязі і іншых найважнейшых кампанентаў інфраструктуры. У ходзе вучэнняў на дапамогу Берыліі прыходзяць нацыянальныя групы хуткага рэагавання ў кіберпрасторы, разгорнутыя для садзейнічання гэтай дзяржаве ў ліквідацыі наступстваў кібератакі. Вучэнні Locked Shields 2019 арганізаваны Цэнтрам кібераабароны НАТА ў супрацоўніцтве з Сіламі абароны Эстоніі, Фінляндыі, камандаваннем узброеных сіламі ЗША ў Еўропе і Інстытутам стратэгіі нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Карэя.

## У Польшчы настаўнікі абвясцілі бестэрміновую забастоўку

Польскія настаўнікі абвясцілі бестэрміновую забастоўку, паставіўшы пад пагрозу правядзенне школьных экзаменаў, перадае карэспандэнт РІА Навіны. Учора ў многіх школах краіны настаўнікі не прыступілі да працы. Вынікі раней праведзенага рэферэндуму сведчаць аб тым, што гатоўнасць прыняць удзел у страйку выказалі 79 працэнтаў школьных педагогаў. Асноўным патрабаваннем настаўнікаў з'яўляецца павелічэнне заработнай платы на тысячу злотых (каля 263 долараў) у месяц.

Будзьце ў курсе

# У СПІСЕ ПРЫЁМАЎ — УЗДА І СМАЛЯВІЧЫ

У нумары за суботу, 6 красавіка, «Звязда» апублікавала графік выязных прыёмаў грамадзян, якія праводзяць на гэтым тыдні ў Мінску і рэгіёнах супрацоўнікі Адміністрацыі Прэзідэнта. Стала вядома, што ў графіку адбыліся змяненні.

Так, **10 красавіка начальнік галоўнага ўпраўлення па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб Рыгор ШЫЛЬК з 14.00 будзе праводзіць прыём ва Уздзенскім райвыканкаме. А 11 красавіка намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Валерый МІЦКЕВІЧ будзе працаваць у Смалявіцкім райвыканкаме з 14.00.**

Усе астатнія час і меса прыёмаў з названага графіка застаюцца без змяненняў. Нагадаем, што запісацца на прыём можна па тэлефонах аддзелаў па рабоце са зваротамі грамадзян адпаведных выканаўчых камітэтаў.

# СЯЎБА ПЕРАЙШЛА ЭКВАТАР

Беларускія аграрыі засеялі больш за палову плошчаў

Па інфармацыі Мінсельгасхарча, па стане на ўчарашнюю раніцу ў краіне пасеяна 531,1 тысячы тон ранніх яравых збожжавых і зернебабовых культур, што складае 63,8 % ад плана. Наперадзе раслінаводы Брэстчыны, якія засеялі 96,6 % запланаваных плошчаў. У тройцы лідараў таксама Гомельская (на 8 красавіка — 86,3 %) і Гродзенская (71,1 %) вобласці. Цалкам глеба пад сяўбу падрыхтавана ў Брэсцкай, Гомельскай і Мінскай абласцях. Дзякуючы добраму надвор'ю сяўба ідзе хуткімі тэмпамі, а яе вынікі нашмат апераджаюць мінулагодні паказчыкі.

**Варвара МАРОЗАВА.**

Надвор'е

# ХАЛОДНЫ ВЕТРЫК ДА НАС СА СКАНДЫНАВІІ

Уначы да 5 марозу, удзень — ад 6 цяпла

**Адносна цёплае надвор'е з невялікімі ападкамі і невялікім туманам чакаецца ў нашай краіне на гэтым тыдні, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

У пачатку тыдня яшчэ захаваецца цёплае надвор'е, а ў сярэдзіне пачнецца паступленне больш халоднага паветра з тэрыторыі Скандынавіі. Менавіта гэты вецер і прынясе істотнае пахаладанне. Сёння ўдзень на паўднёвым усходзе краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ў асноўным складзе 9—15 цяпла, па паўднёвым усходзе краіны паветра прагрэецца ад плюс 16 да плюс 18 градусаў. У сераду пад уплывам перыферыі скандынаўскага антыцыклону будзе пераважна без ападкаў. Тэмпература паветра ўначы па краіне ў асноўным складзе ад мінус 5 да плюс 2 градусаў, удзень — 6—13 градусаў вышэй нуля. Па паўднёвым усходзе будзе крыху цяплей. Там уначы чакаецца 3—8 цяпла, удзень — плюс 14—15 градусаў. У чацвер у вобласці павышанага атмасфернага ціску істотных ападкаў не чакаецца. Уначы і раніцай у асобных раёнах магчымы слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 2 градусаў да 5 цяпла, пры праясненнях панізіцца да мінус 5 градусаў. Удзень будзе 6—13 цяпла, па паўднёвым усходзе — да 14—15 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пятніцу ў асобных раёнах краіны пройдуць невялікія кароткачасовыя ападкі, у асноўным дождж. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 3 градусаў да плюс 4 градусаў, пры праясненнях паветра астудзіцца да 5 марозу. Удзень будзе 6—13 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Здарэнні

# Спаліў траву і разам 17 пабудоў

Беларусь працягваюць абмінаць дажджы. З-за гэтага ў экасістэмах краіны складваецца вельмі небяспечная пажарная абстаноўка. Абцяжарвае яна тым, што навесці парадак і знішчыць высахлую траву на ўласных падворках людзі даручаюць агню. У такім выпадку гараць будынкі, і — самае страшнае — гінуць людзі.

— З часу, калі трывала ўстанавілася цёплае надвор'е, у экасістэмах здарылася 1029 пажараў, — паведамілі ў прэс-службе Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. — Агонь «прагуляўся» па агульнай плошчы ў 427 гектараў. Прычым варта адзначыць, што больш узгаранняў прыходзіцца на Брэсцкую, Мінскую і Магілёўскую вобласці. Сумарна ў гэтых трох рэгіёнах ратавальнікі выязджалі па такіх выкліках 855 разоў.

Увечары 5 красавіка ратавальнікі выехалі тушыць пажар у вёску Янаполле Хоцімскага раёна. На гэтым узгаранні загінула 82-гадовая пенсіянерка. Істотныя апёкі (15—20 % цела) атрымалі яшчэ дзве жанчыны сталага веку на Магілёўшчыне. А ў вёсцы Панарка Смаргонскага раёна згарэлі чатыры нежылыя дамы, дзве дачы і 11 пабудоў гаспадарчага прызначэння. Адзіны 44-гадовы жыхар растлумачыў ратавальнікам, што, хутчэй за ўсё, незатушаны недакурак, кінуты ў сухую траву на ўласным падворку, і прывёў да такой бяды.

За выпальванне сухой травы прадугледжаны штраф да 40 базавых велічынь. Калі шкода істотная, то вінаўніка прыцягнуць ужо да крымінальнай адказнасці. Таму мо варта пашукаць больш цывілізаваныя спосабы пазбаўлення ад высахлай травы?

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

# ЭНЕРГІЯ БУДУЧЫНІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Залішне нагадваць, якую вялікую важнасць гэтая тэма мае для Беларусі, дзе электрычнасць і цяпло ў асноўным выпрацоўваюцца за кошт спальвання мільярдаў кубаметраў дарагога імпартнага газу. Мала таго што гэта велізарныя выдаткі, дык яшчэ і моцная залежнасць ад суседняй краіны. Таму наша краіна таксама імкнецца асвойваць альтэрнатыўныя віды энергіі. Ёсць пэўныя поспехі, але нямала і праблем. Аб гэтым размова з **выканаўчым дырэктарам Беларускай асацыяцыі «Аднаўляльная энергетыка» Уладзімірам НІСЦЮКОМ.**

## Патэнцыял і рэаліі

— Больш-менш актыўна займацца развіццём гэтага сектара энергасістэмы, — гаворыць Уладзімір Пятровіч, — у Беларусі пачалі пасля 2010 года, калі быў прыняты закон аб аднаўляльных крыніцах энергіі (АКЭ). Зараз у краіне дзейнічаюць усю 55 фотаэлектрычных станцый (ФЭС), якія выкарыстоўваюць сонечнае выпраменьванне, больш за паўсотню ГЭС, 98 ветрагенератарных установак, два дзясяткі біягазавых комплексаў, а таксама 8 міні-ТЭЦ, што працуюць на драўняным паліве. Самыя буйныя з іх — Рэчыцкая ФЭС магутнасцю 56 МВт, ветрапарк з шасці аб'яднаных агрэгатаў у Навагрудскім раёне (9 МВт), Віцебская ГЭС (40 МВт), біягазавы комплекс у СВК «Світанак» Кіраўскага раёна (4,8 МВт). Устаноўленая магутнасць усіх падобных аб'ектаў па краіне складае амаль 400 мегават — каля пяці працэнтаў магутнасці энергасістэмы ў цэлым. Такія вынікі даюць падставу многім чыноўнікам заяўляць аб паспяховым выкананні планаў па ўводзе ў строй генератарных установак з выкарыстаннем альтэрнатыўных рэсурсаў — ветру, сонца, біягазу і іншых. Але трэба ўлічваць, што ўстаноўленая магутнасць далёкая ад рэальнай. Вецер дзьме не кожны дзень, а сонца не свеціць уначы. У нашых кліматычных умовах каэфіцыент карыснага дзеяння, напрыклад, сонечных электраагрэгатаў у сярэднім не перавышае 15 працэнтаў, ветравых — 30. Такім чынам, мы можам канстатаваць, што пакуль з аднаўляльных крыніц вырабляецца ўсяго каля 1 % электрычнасці. З аднаго боку, калі ўлічваць вельмі кароткі тэрмін дзейнасці ў згаданым кірунку, гэта істотны крок наперад, можна сказаць, прарыў. А з іншага — мізар, бо патэнцыяльна Беларусь можа выпрацоўваць за кошт АКЭ да 40 працэнтаў электрычнасці.

## Ад буму да спаду

**— А што перашкаджае?**

— Пасля таго як у свой час Прэзідэнт паставіў задачу па максімуме выкарыстоўваць мясцовыя віды паліва і наогул актыўна шукаць альтэрнатыўныя крыніцы энергазабеспячэння, было прынята нямала рашэнняў, скіраваных на дасягненне гэтай мэты. Для аднаўляльнай энергетыкі рэвалюцыйную ролю адыграў адпаведны закон, пра які я ўжо згадваў. Станцыі, комплексы, адзінкавыя агрэгаты з выкарыстаннем АКЭ сталі расці як грыбы пасля дажджу. Актыўна пайшлі замежныя інвестыцыі ў гэты сектар эканомікі. Аднак праз некалькі гадоў бум скончыўся. Справа вось у чым. Любая структура, дзяржаўная або прыватная, пабудаваўшы ўстаноўку на АКЭ, падключае яе да адзінай энергасістэмы. Усю электрычнасць, якую вырабляе такі агрэгат, «Белэнерга» па законе абавязана купіць. Прычым па больш высокіх тарыфах у параўнанні з тымі, якія прапануе сваім спажыўцам. Такая схема была прынята, каб зацікавіць патэнцыяльных інвестараў, прадпрымальнікаў займацца развіццём у Беларусі альтэрнатыўнай энергетыкі. І, як мы бачым, падобная практыка дала вялікі плён.

Калі ж АКЭ стала з'яўляцца ўсё больш і больш, дзяржаўны манапаліст забіў трывогу. Бо завышаныя тарыфы «альтэрнатыўшчыкаў» яму прыходзілася кампенсаваць за кошт спажыўцоў, павялічваючы плату за электрычнасць у тым ліку і для насельніцтва. Таму была ўведзена сістэма квот. Стала немагчыма будаваць энергетычныя ўстаноўкі на АК звыш той магутнасці, якую табе дазволілі. А прадугледжаныя законам павышаныя тарыфы для гэтага сектара ўжо прыходзіцца адстойваць у жорсткіх дыскусіях. У выніку рост альтэрнатыўнай энергетыкі замарудзіўся. Гэты негатыўны працэс узмацняецца тым, што ўжо разглядаецца гатовы праект новых заканадаўчых ініцыятыў, якія яшчэ больш ускладняць умовы для існавання АЭ.

Наша асацыяцыя, у якую уваходзяць больш за 60 аўтарытэтных арганізацый, у тым ліку дзяржаўных, буйных айчынных і замежных кампаній, прыватных бізнесменаў, выказваецца супраць такіх паспешлівых крокаў. Павышаныя тарыфы, аб якіх я сказаў вышэй, дзейнічаюць у адносінах да таго ці іншага інвестара толькі на працягу 10 гадоў з моманту ўводу аб'екта, што працуе на АКЭ. Больш за тое, сёння ўжо некаторыя інвестары гатовыя нават адмовіцца ад ільгот, толькі б ім дазволілі свабодна працаваць. На працягу амаль дзесяцігоддзя нашы цесныя стасункі з органамі ўлады дазвалялі знаходзіць кампрамісныя рашэнні, якія спрыялі развіццю альтэрнатыўнай энергетыкі. Гэта заўсёды быў узорны прыклад дзяржаўна-прыватнага партнёрства. Спадзяёмся, што яно будзе так і надалей.

## Нельга адстаць безнадзейна

**— А можа, Міністэрства энергетыкі якраз дзейнічае правільна, выступаючы за жорсткія правілы для альтэрнатыўшчыкаў. Нельга ж на самай справе дапусціць, каб нейкія фактары ўплывалі на павышэнне кошту электрычнасці?**




— Гэта было б правільна, калі б у нас было, як у Германіі. Там — пад 30 тысяч ветракоў і звыш 8 мільёнаў сонечных станцый. Ды яшчэ тысячы біягазавых комплексаў. На АКЭ ўжо прыходзіцца трэць энергасістэмы краіны. Не дзіўна пасля гэтага, што немцы адмовіліся ад спальвання вугалю на ТЭЦ — бо аднаўляльная энергетыка дазваляе у значнай меры перакрыць магутнасці гэтых аб'ектаў. У нас жа яна толькі ў зародкавым стане. Таму трэба на цяперашнім этапе зрабіць усё магчымае, нават пайсці на нейкія выдаткі, каб не загубіць тое, што, па маім перакананні, з'яўляецца энергіяй будучыні. Мы не павінны ў гэтай справе безнадзейна адстаць. Чым больш уводзіцца ў строй установак з выкарыстаннем АКЭ, тым больш яны падаюць у цане. Думаю, у хуткім часе электрычнасць і цяпло, што будуць вырабляцца на такіх комплексах, стануць таннейшыя за атрыманыя традыцыйным спосабам. Бо запасы нафты і газу абмежаваныя, гэтыя рэсурсы абавязкова з цягам часу падаражэюць. Дарэчы, тое ж можна сказаць пра ўран, які з'яўляецца палівам атамных станцый і запасы якога ў нетрах таксама абмежаваныя.

І яшчэ адзін важны момант. Калі мы вядзём размову аб аднаўляльнай энергетыцы, то ў першую чаргу падкрэсліваем яе экалагічнасць. Гэта самая чыстая энергія, і чалавецтва не зможа без яе абысціся. Парыжскія пагадненні, падпісаныя амаль дзвюма сотнямі краін, аб скарачэнні небяспечных выкідаў — не жэст добрай волі, а хутчэй крык адчаю. Па сутнасці, свет апынуўся перад праблемай выжывання, а як яе вырашыць — не вельмі разумее. Бо некаторыя дзяржавы, напрыклад ЗША, нават і не думаюць далучацца да пагаднення. Відавочна, што выратаванне — у хуткім развіцці аднаўляльнай энергетыкі. Калі ўзяць канкрэтна Беларусь — штогод у нас брудныя выкіды складаюць каля 90 мільёнаў тон. Толькі каля 25 з іх паглынаецца лясамі і балотамі. Астатняе, можна сказаць, нам. Каб не задыхнуцца, трэба або павялічыць у некалькі разоў лесапасадкі, што немагчыма, або зменшыць атручванне паветра хімікатамі. Мы прапануем самы лепшы спосаб. Мяркуйце самі: напрыклад, ветрагенератар магутнасцю ў 1 МВт штогод скарачае брудныя выкіды ледзь не на дзве тысячы тон.

## АЭС і АКЭ хутчэй сябры, чым канкурэнты

**— Вы згадалі беларускую АЭС. Хтосьці скажа, што з яе ўводам лёс аднаўляльнай энергетыкі апынецца пад яшчэ большым пытаннем...**

— Вялікая памылка лічыць, што яна можа перашкодзіць выкарыстоўваць магутнасці АЭС з найбольшай эфектыўнасцю. Па-першае, крызісныя з'явы ў эканоміцы не вечныя. Калі пойдзе рост, а сучасная эканоміка вельмі энергаёмістая, значна павялічыцца і спажыванне электрычнасці. Да таго ж, выйсце заўсёды можна знайсці. Напрыклад, ёсць добрая праграма па развіцці ў краіне электратранспарту, ад якога нам нікуды не дзецца. Па-другое, мы будуем атамную станцыю і дзеля таго, каб скараціць спажыванне прыроднага газу. А гэта значыць, што магутнасці ТЭЦ у будучым трэба паменшыць. Што дрэннага ў тым, калі мы станем замяняць цеплавую энергію не толькі атамнай, але і аднаўляльнай? Я ўжо казаў, што яна абавязкова паменшыцца ў цане. І не толькі з прычыны павелічэння колькасці «альтэрнатыўных» установак, але і таму, што пастаянна з'яўляюцца новыя, больш танныя і эфектыўныя матэрыялы, тэхналогіі. І для паспяховага развіцця энергетычнага сектара ў ім павінна існаваць здаровая канкурэнцыя. Тым больш што дзяржава хуткі адыход ад перакрыжаванага субсідавання. Грамадзяне будуць цалкам аплачваць спажыванне электраэнергіі і цяпла. У іх павінен быць выбар пастаўшчыка.

## Лепш без гігантаманіі

**— І ўсё ж, як многім здаецца, рабіць у сённяшніх складаных умовах сур'ёзную стаўку на аднаўляльную энергетыку даволі рызыкоўна. Вецер у нас не дужа моцны, сонца не вельмі гарачае, гейзераў няма. Напрыклад, каб замяніць адну ТЭЦ у 1000 МВт фотаэлектрычнай станцыяй, спатрэбіцца, як пішуць навукова-папулярныя выданні, пакрыць спецыяльнымі дарагімі панэлямі тэрыторыю ў 25—30 квадратных кіламетраў. Аналагічная сітуацыя з ветракамі. Дзе мы набяромся столькі плошчаў?**

— Плошчы ёсць. Можна задзейнічаць такі каласальны рэсурс, як чарнобыльская зона, дзе няма ніякай гаспадарчай дзейнасці. А, напрыклад, для ветрагенератараў падыдзе любы ўчастак з дастатковай сілай ветру. Іх можна ставіць нават у лясных масівах з такім разлікам, каб лопасці знаходзіліся над верхавінамі дрэў. Гэта калі казаць пра стварэнне прамысловых магутнасцяў. Але не абавязкова кідацца ў гігантаманію. Найбольш рацыянальны варыянт — мінігенератарныя станцыі, якія можна размяшчаць на дахах жылых дамоў і прадпрыемстваў, на прысядзібных участках. А калі ўзяць, скажам, геатэрмальныя помпы, то яны наогул закопваюцца ў зямлю, якая выступае ў якасці першапачатковай крыніцы цяпла, неабходнай для работы агрэгата.

**— Якое можа быць цяпло зямлі ў трэскучыя зімнія маразы?**

— Зімой у нас грунт прамярзае не больш як на паўтара метра. Далей ужо тэмпература дзякуючы ўплыву распаленага ядра планеты не ніжэйшая за 5—7 градусаў. Гэтага дастаткова для работы канструкцыі, якая працуе па прынцыпе халадзільніка, толькі наадварот. У закальцаваную сістэму запускаюць хладагент, часцей за ўсё фрэон, які пры тэмпературы ў некалькі градусаў з плюсам ператвараецца ў газ. Яго сціскаюць кампрэсарам, ад чаго хладагент разагрэецца да 60—65 градусаў. Гэтым патокам у сваю чаргу награюць ваду, якая потым трапляе ў жылы будынак. У Швецыі, напрыклад, па такой схеме — у разнастайных, канешне, варыяцыях — ацяпляецца звыш паўмільёна дамоў.

Тут неабходна адзначыць важную дэталь. Згодна з беларускім заканадаўствам, электрагенератарныя і цеплавыя ўстаноўкі на аснове АКЭ, якія выкарыстоўваюцца фізічнымі і юрыдычнымі асобамі для забеспячэння сваёй гаспадарчай дзейнасці, не патрабуюць квотавання. Таму тут можна чакаць бурнага росту колькасці агрэгатаў і сістэм самых розных відаў.

## Пункт незвароту

**— Якія яшчэ, на ваш погляд, кірункі ў нашым энергетычным сектары будуць развівацца найбольш паспяхова?**

— Адзін з самых перспектыўных кірункаў — біягазавая энергетыка. У нас для гэтага велізарныя аб'ёмы сыравіны — пачынаючы ад бытавых і харчовых адходаў, заканчваючы тэхнічнымі раслінамі і ўгнаеннямі. У сувязі з моцным развіццём жывёлагадоўлі магчымасцяў захавання ўгнаенняў не хапае. Трэба шукаць тэхналогіі іх перапрацоўкі.

Ці яшчэ невялікі прыклад. Некалькі гадоў таму паблізу Віцебска на палігоне бытавых адходаў шведская кампанія пабудавала электрастанцыю магутнасцю ў 1 МВт. Палівам для яе з'яўляецца біягаз, які атрымліваецца пры гніенні звалачнага смецця. Газ, у складзе якога шмат метану, улоўліваецца з дапамогай спецыяльнай тэхналогіі. Каб атрымліваць столькі электраэнергіі, колькі вырабляе гэты аб'ект, на традыцыйнай ТЭЦ у год прыйшлося б спаліць каля паўтары тысячы тон умоўнага паліва. Пяць-шэсць такіх «сметнікавых» агрэгатаў маглі б забяспечыць электрычнасцю прадпрыемства маштабам з тэлезавод «Віцязь». Зараз у краіне эфектыўна працуюць ужо сем падобных установак.

Вельмі цікавы кірунак — узвядзенне маленькіх ГЭС магутнасцю ад некалькіх дзясяткаў да некалькіх сотняў кілават. Яны ўжо з'явіліся ў Мінску, Жодзіне, іншых населеных пунктах рэспублікі. Прычым для малой гідраэнергетыкі не абавязкова мець раку. Для гэтай мэты з поспехам выкарыстоўваюцца патокі ачышчальных збудаванняў. Такая міні-ГЭС ужо эфектыўна працуе ў сталічным аб'яднанні «Мінскводаканал».

У Беларусі таксама з'явіліся і будуць актыўна ўкараняцца энергетычныя ўстаноўкі, якія выкарыстоўваюць нафтавыя адходы. Прычым ёсць тэхналогія, дзякуючы якой, напрыклад, мазут або дызель на чвэрць разбаўляюць вадой. Пры гэтым якасць паліва толькі паляпшаецца.

Добры эфект дае перапрацоўка хімічнага смецця на піролізным абсталяванні. У выніку атрымліваецца піролізнае масла, піролізны газ і піролізны кокс, якія з'яўляюцца вельмі карыснай сыравінай для хімічных прадпрыемстваў. Трэба адзначыць, што гэта абсталяванне — айчыннае. Яно не толькі карыстаецца попытам у Беларусі, але і ўсё больш актыўна пачынае рэалізоўвацца за мяжой.

Упэўнены, добрая будучыня ў ветравых паркаў, сонечных станцый і геатэрмальных помпаў, аб якіх ужо расказаў. Што б ні здарылася, мяне радуе адно: працэс развіцця аднаўляльнай энергіі ўжо набыў характар незваротнага. А калі дарогі назад няма, то і дзейнічаць трэба адпаведна — рабіць усё магчымае, каб інавацыйныя ідэі ў сферы энергетыкі хутка ўвасабляліся ў жыццё.

**Гутарыў Міхаіл КАВАЛЁЎ.**

Юрыдычная даведка

# Пра штрафы, аліменты, падаткі...

## і іншыя даўгі раскажуць у кантакт-цэнтры органаў прымусовага выканання

**Месяц штодзённага біцця даўжніка па нагах металічным кіем. Такім у Расіі ў XV—XVIII стагоддзях было мінімальнае прымусовае судовае спагнанне, якое называлася «правеж». Праўда, пасля такога пакарання чалавек не тое што не мог вярнуць доўг, а ўвогуле станавіўся калекам. Праз такое бессэнсоўнае спагнанне і з'явілася ў рускай мове выслоўе «в ногах правды нет». Пад праўдай тады меўся на ўвазе той самы доўг, які чалавек не мог вярнуць. Сучасныя судовыя выканаўцы, вядома, ніякіх жахаў у дачыненні да даўжніка не прымяняюць, аднак невяртанне грошай, узятых у пазыку, — гэта і цяпер не вельмі прыемная з'ява, якая мае свае наступствы. Для спрашчэння стасункаў паміж даўжніком і выканаўцам з лета 2018-га ў краіне працуе кантакт-цэнтр органаў прымусовага выканання. За пару хвілін па тэлефоне можна атрымаць літаральна ўсю даведачную інфармацыю.**

### Прапушчаныя званкі і аўтаінфарматар

Ці ёсць у мяне доўг? Дзе яго запазычанасць? Куды адвезці квітанцыю? Хто мой судовы выканаўца? Адкуль у мяне ўвогуле ўзялася запазыка? Як падаць дакументы на афармленне выканаўчага вядзення? Найбольш частa даведачна-інфармацыйнай службе органаў прымусовага выканання задаюць менавіта такія пытанні. У першы ж месяц работы кантакт-цэнтра сюды пазванiла больш за 200 чалавек. Цяпер штомесяц звяртаецца каля 650 грамадзян.

— Асноўная задача кантакт-цэнтра — паведамленне мінімальнага аб'ёму інфармацыі аб выканаўчым вядзенні: дзе яно знаходзіцца, хто выканаўца, яго кантакты, дні прыёму, сума запазычанасці, — расказаў **галоўны судовы выканаўца Беларусі Дзмітрый КАВАЛЕНКА.** — 60—70 працэнтаў запытаў маюць даведачна-інфармацыйны характар.

Доўжацца званкі па-рознаму. Як правіла, дзве-тры хвіліны, але ёсць размовы і па гадзіне. Аператары запісваюць тэму званка чалавека, каб высветліць, якія далейшыя крокі прымаць. Па пытаннях, якія задаюць найбольш часта, накшталт «Як спагнаць аліменты?» ці «Як разлічыць запазычанасць?», спецыялісты рыхтуюць адказы і размяшчаюць іх на сайце Міністэрства юстыцыі.

У кантакт-цэнтр можна пазваніць са стацыянарнага ці мабільнага тэлефона з 9 да 18 гадзін. Неадказаныя званкі не застаюцца без увагі — спецыяліст абавязкова перазвоніць.

— Нават калі чалавек паклаў трубку, не выслухаўшы да канца аўтаінфармацыю цэнтра, калі ўсе аператары занятыя, спецыяліст пасля абавязкова звяжацца з ім, — сцвярджае галоўны судовы выканаўца. — Аналізуючы званкі, мы высветлілі, што па рабоце некаторых асобных аддзелаў паступала больш за ўсё пытанняў. Таму ў гэтых структурах уведзены пілотныя рабочыя адзінкі — спецыялісты, на якіх з кантакт-цэнтра перанакіроўваюць асаблівыя званкі. І гэтыя людзі ў межах аддзела размаўляюць з чалавекам і адказваюць на хвалючыя яго пытанні.

У Мінюсце не выключаюць, што з часам у кантакт-цэнтры з'явіцца і аўтаінфарматар. Сістэма вызначыць, па якім пытанні звярнуўся чалавек — штраф, аліменты, падаткі, — і падбярэ адпаведныя адказы.

### Скаргі, непаразуменні і страх інтэрнэту

Прымаць скаргі на дзеянні судовага выканаўцы ў абавязкі кантакт-цэнтра не ўваходзіць. Тым не менш чалавека ўсё роўна выслухаюць і раскажуць пра парадак працэсуальнага абскарджвання дзеяння або бяздзейнайсці службовай асобы. Растлумачаць, што выканаўца можа і павінен рабіць і якім чынам.

— Нельга спрабаваць вырашыць праз кантакт-цэнтр канфлікт паміж даўжніком і судовым выканаўцам. Па званку ніякія скаргі разглядацца не павінны. Калі ўжо накіпела, то напішыце заўвагі, а не так, што выгаварыліся і чакаеце, што вашы пытанні нехта пасля пойдзе вырашаць, — раіць Дзмітрый Каваленка. — У гэтым плане аператар павінен быць крыху і псіхолагам, каб зніveляваць праблему. Можа, чалавеку толькі і трэба, каб яго выслухалі. Аднак часта людзі не разумеюць памераў сваіх правоў, змешваюць словы з эмоцыямі, не хочуць разумець і чуць аператара. Адночы мне прынеслі паўтарагадзінны запіс з нецэнзурнай лексікай грамадзяніна, які толкам не мог растлумачыць, што ён хоча. У дадзеным выпадку гэта была падстава звярнуцца ў праваахоўныя органы, каб яны далі прававую ацэнку такім выказванням.

Часта бывае, што чалавек проста не разумее свайго судовага выканаўцу, нават калі той стараецца. Па меры сіл аператару трэба растлумачыць чалавеку даступнай мовай, у чым сутнасць праблемы і што яму трэба рабіць.

Адказы даведачнага характару схіляюць некаторых да думкі, што кантакт-цэнтр — гэта своеасаблівы аналаг рэестра даўжнікоў, які змешчаны на сайце Мінюста. Аднак у рэестры не ўбачыш, напрыклад, разліковыя рахункі, куды пераводзіць грошы, і не даведаешся, дзе шукаць судовага выканаўцу ці яго начальніка. Многія проста дагэтуль не ўмеюць або не хочуць карыстацца інтэрнэтам і камп'ютарам і ў той рэестр нават не глядзяць. Так што адзінае выйсце для іх — тэлефанаванне. Некаторыя не хочуць шукаць сайт ды яшчэ ўводзіць на партале свае пашпартныя даныя, бо баяцца, што злачынцы могуць іх скрасці і выкарыстаць, каментуе Дзмітрый Каваленка:

— Такія меркаванні беспадстаўныя, бо злучэнне ў нас на сайце абароненае. А задача кантакт-цэнтра — забяспечыць атрыманне ўсіх званкоў у рабочы час і зрабіць сістэму органаў прымусовага выканання максімальна адкрытай. У прыёмны дзень судовага выканаўцы аператары, дарэчы, маюць права нават пераключыць на яго нумар чалавека, каб вырашыць пытанне непасрэдна з ім.

**Ірына СІДАРОК.**

# НАЙЛЕПШЫЯ З НАЙЛЕПШЫХ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Пераможцамі заключнага рэспубліканскага тура сталі 688 школьнікаў. У адпаведнасці з Інструкцыяй аб правядзенні рэспубліканскай алімпіяды дыпломамі першай ступені могуць быць узнагароджаны не больш як 20 % удзельнікаў (іх уладальнікамі сталі 132 вучні), другой ступені — не больш як 30 % (210 удзельнікаў) і трэцяй — не больш як 50 % (346 чалавек).

**«Вельмі рэдка ў алімпіядным руху з'яўляюцца навічкі-адзінаццацікласнікі».**

— Нягледзячы на тое што алімпіяда праводзіцца сярод вучняў 9—11 класаў, навучэнцам малодшых класаў таксама не забараняецца выконваць алімпіядныя заданні, напрыклад, за 9 клас. Так, сёлета на алімпіядзе па беларускай мове і літаратуры замахнуліся на заданні за 9 клас чатыры васьмікласнікі і тры з іх атрымалі дыпломы, — расказала Анжэла Кудаярава. — А васьмікласніца Яўгенія Кабяк, навучэнка гімназіі № 1 з Наваполацка, стала абсалютным пераможцам сярод дзевяцікласнікаў. Яна набрала найбольшую колькасць балаў сярод усіх удзельнікаў: яе сума магла быць яшчэ большай, але дзяўчынка «спатыкнулася» на тых заданнях, якія яшчэ не праходзіла па праграме.

Сярод пераможцаў рэспубліканскага тура былі не толькі гімназісты, ліцэісты, але і прадстаўнікі школ з сельскай мясцовасці, прычым у такіх традыцыйна складаных для школьнікаў дысцыплінах, як фізіка і матэматыка.

### Плавалі, бегалі і адказвалі на пытанні

**Лот № 5.** Изолированное помещение с инв. № 200/D-163119, площадью 555,1 кв. м. Наименование: бытовые помещения. Назначение: помещение неустановленного назначения, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81/19-11. **Нач. цена:** 82796,69 бел. руб. (без НДС). **Задаток:** 8279,66 бел. руб.

**Лот № 6.** Изолированное помещение с инв. № 200/D-123350, площадью 161,8 кв. м. Наименование: административное помещение. Назначение: административное помещение, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81/19-14. **Нач. цена:** 21175,37 бел. руб. (без НДС). **Задаток:** 2117,53 бел. руб.

**Лот № 7.** Изолированное помещение с инв. № 200/D-163107, площадью 330,4 кв. м. Наименование: административное помещение. Назначение: административное помещение, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81/19-16. **Нач. цена:** 54040,97 бел. руб. (без НДС). **Задаток:** 5404,09 бел. руб.

**Лот № 8.** Изолированное помещение с инв. № 200/D-163111, площадью 265,5 кв. м. Наименование: административное помещение. Назначение: административное помещение, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81/19-16в. **Нач. цена:** 43448,27 бел. руб. (без НДС). **Задаток:** 4344,82 бел. руб.

**Лот № 9.** Изолированное помещение с инв. № 200/D-163108, площадью 37,7 кв. м. Наименование: административное помещение. Назначение: административное помещение, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81/19-16а. **Нач. цена:** 6143,93 бел. руб. (без НДС). **Задаток:** 614,39 бел. руб.

**Лот № 10.** Изолированное помещение с инв. № 200/D-163109 площадью 142,3 кв. м. Наименование: административное помещение. Назначение: административное помещение по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81/19-16б. **Нач. цена:** 23272,35 бел. руб. (без НДС). **Задаток:** 2327,23 бел. руб.

**Лот № 11.** Капитальное строение с инв. № 200/С-86458, площадью 489,7 кв. м. Наименование: здание корпуса гильотины. Назначение: здание специализированное для производства машин и оборудования (машиностроения). **Нач. цена:** 39 300,00 бел. руб. (без НДС). **Задаток:** 3930,00 бел. руб.

**Дата, время и место проведения аукциона:** 11.05.2019 в 15.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатков и приема документов:** с 09.04.2019 по 10.05.2019. Срок подписания договора купли-продажи: 20 календарных дней со дня проведения аукциона, оплата за объект производится в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи. Условие аукциона: возмещение затрат по подготовке документации, оплата НДС сверх цены продажи объекта. Изолированные помещения и капитальные строения расположены на земельном участке с кадастровым номером 240100000001002628 (общая долевая аренда)

**Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30. до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609. Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем РБ – копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица РБ – доверенность (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр. лица – документ, подтверждающий его полномочия. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) обязан перечислить затраты на организацию и проведение аукциона, возместить затраты по оценке имущества на расчетный счет, указанный в протоколе аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона. **Задаток перечисляется на р/с ККУП «Витебский областной центр маркетинга» № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566.** Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее, чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. Доп. информацию можно получить по тел.: (0212) 24-63-14, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by.

### Извещение о проведении открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел. (0212) 24-63-14.

| Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка |
|---|
| Лот № 1. Земельный участок с кадастровым № 221887008601000105 площадью 0,1845 га по адресу: Витебская обл., Городокский р-н, Пальминский с/с, д. Хоботы, ул. Центральная, 9А для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона реки, водоема (р. Лужеснянка, оз. Вымно), придорожная полоса (контролируемая зона) автомобильной дороги, охранная зона электрических сетей напряжением до и свыше 1000 В. **Начальная цена**: 2000,00 бел. руб. **Размер задатка:** 200,00 бел. руб. Реквизиты для внесения задатка: р/с BY82AKBB36003160870090000000 «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Пальминский сельсовет) |
| **Дата, время и место проведения аукциона:** 10.05.2019 в 09.30 по адресу: Витебская обл., Городокский р-н, г. Городок, ул. Пролетарская, 2, в Городокском районном исполнительном комитете. **Срок внесения задатков и приема документов:** с 09.04.2019 с 8.30 по 04.05.2019 до 16.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» с 8.30 до 17.30 в рабочие дни. **Для участия в аукционе приглашаются** граждане Республики Беларусь, негосударственные юр. лица Республики Беларусь, консолидированные участники (двое и более граждан, негосударственных юр. лиц Республики Беларусь). **Условия:** обратиться в течение 2 месяцев со дня проведения аукциона в Городокское бюро РУП «Витебское агентство по гос. регистрации и зем. кадастру» за гос. регистрацией права на зем. участок; гражданин в течение 1 года, а негосударственное юридическое лицо в течение 6 месяцев со дня государственной регистрации возникновения права на зем. участок, приступить к занятию данного зем. участка в соответствии с целью и условиями его предоставления (начать строительство) для чего: в установленном порядке разработать, согласовать и утвердить проектную документацию на строительство объекта и подключение его к инженерным коммуникациям; получить в отделе архитектуры и строительства, жилищно-коммунального хозяйства Городокского райисполкома разрешение на строительство объекта; снять из-под пятен застройки на занимаемом зем. участке плодородный слой почвы и использовать его для благоустройства территории участка; соблюдать обязанности землепользователя зем. участка, предусмотренные ст. 70 и 89 Кодекса Республики Беларусь о земле. |

Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462. Для участия в аукционе гражданин, юр. лицо подают заявление об участии в аукционе, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка, заключают с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность; представителем или уполномоченным должностным лицом юр. лица – доверенность, выданная юр. лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих гос. регистрацию юр. лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юр. лица; консолидированными участниками – оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе. При подаче документов на участие в аукционе граждане предъявляют паспорт гражданина РБ, а представители граждан и юр. лиц, уполномоченные должностные лица юр. лиц – документ, удостоверяющий личность. При подаче документов уполномоченное лицо предъявляет доверенности, выданные гражданами, юр. лицами, заключившими договор о совместном участии в аукционе. **Условия аукциона: победитель аукциона, единственный участник несостоявшегося аукциона обязан:** в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся: внести плату за зем. участок и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией. Назначение зем. участков в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: 1 09 02 – зем. участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по гос. регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Аукцион состоится при наличии не менее 2 участников. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра на местности зем. участка. Конт. тел.: (0212) 24-63-14, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by.

**ЗАСО «Промтрансинвест» предлагает принять участие в процедуре закупки № 2019-692056,** размещенной на сайте http://www.icetrade.by, по «Бизнес / финансы / страхование > Юридические и патентные услуги».

УНП 100357923

## ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Планар» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже **здания многофункционального** (одноэтажное кирпичное с пристройкой) **общей площадью 1025,3 кв. м, инв. № 601/С-28859**, **расположенного на земельном участке площадью 0,9668 га с кадастровым номером 623288000016000002 (право постоянного пользования) по адресу: Минская область, Логойский район, Янушковичский с/с, 10.** Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав: *охранная зона линий электропередачи напряжением свыше 1000 вольт, пл. 0,9668 га). Часть здания пл. 239,4 кв. м сдается в аренду.*

**Начальная цена** с НДС (20 %) – **46 800,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **4 680,00** бел. руб.). Стоимость снижена на **50 %.**

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 2 (двух) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Предыдущие извещения опубликованы в газете «Звязда» от 23.01.2019, 12.03.2019. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Аукцион состоится **23.04.2019** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **22.04.2019** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

Вернісаж. Памяць сэрца: *Сумесны праект «Звязды» і Нацыянальнага мастацкага музея*

# «ПРОСТЫЯ» ПРЫПАВЕСЦІ ВІКТАРА ГРАМЫКІ

Да 75-годдзя вызвалення 1944 2019

**Вялікі філосаф, пясняр «сельскай» тэмы, ганаровы член Нацыянальнай акадэміі навук, прафесар, педагог Беларускай дзяржаўнай Акадэміі мастацтваў з амаль 40-гадовым стажам выкладання, майстар тэматычных палотнаў, партрэтаў і пейзажаў, якія прадстаўлены ў найбуйнейшых музеях свету. Герой сённяшняй рубрыкі — народны мастак Беларусі Віктар Аляксандравіч ГРАМЫКА (нар. 1923 г.).**

...Вайну ён сустрэў 18-гадовым юнаком. Усяго за дзень да пачатку Вялікай Айчыннай скончыў 10 клас і атрымаў атэстат сталасці, а ўжо неўзабаве стаў падпольшчыкам у групе Канстанціна Заслонава, пазней — партызанам Смаленскага палка асаблівага прызначэння. Сведчанне яго баявых заслуг — шматлікія ўзнагароды: ордэны Айчыннай вайны I ступені, Чырвонай Зоркі, медалі «За адвагу», «Партызану Айчыннай вайны» I ступені і іншыя.

Але ж і ў гады вайны Віктар Грамыка заставаўся мастаком. Ён паспеў пасля сямігодкі павучыцца ў Віцебскай мастацкай вучэльні і нават стаць пэўным феноменам: вярнуўшыся ў сваю аршанскую школу, быў там адначасова вучнем і настаўнікам малявання. Таму не дзіва, што ў партызанскім атрадзе Грамыка быў нарасхват як партрэтыст і менавіта яму даверылі выданне палкавой газеты «Народны мсцівец».

Безумоўна, для Віктара Грамыкі тэма вайны вельмі асабістая. І, відаць, якраз з прычыны таго, што Грамыка прайшоў вайну, ведаў яе знутры, ён заўжды ставіўся да гэтай тэмы надзвычай адказна, не «злоўжываў» ёю. Яму цяжка было прытрымлівацца кананічных схем у распрацоўцы гэтай тэмы. Згадайма, напрыклад, знакамітую карціну «Салдаты» (1967) з выявай трох ветэранаў, якія памінаюць палеглых аднапалчан. Мастацтвазнаўца Барыс Крэпак успамінаў: «Колькі было спрэчак і дыскусій вакол гэтага палатна! Мастака безапеляцыйна абвінавацілі ў «агрубленні рэчаіснасці» і ледзь не ў прапагандзе... алкагалізму. Які, маўляў, прыклад для моладзі? З пазіцыі «прычасанасці», якой надзяляліся многія тагачасныя сусальныя карціны з ваеннымі сюжэтамі, падобныя папрокі былі прывычна зразумелыя. Але штабелі прыкра-парадных пастараляў пра вайну, якіх у тыя часы было вельмі шмат, даўно адышлі ў нябыт, а палатно «Салдаты» і па сённяшні час засталося пранізліва-глыбокай «насечкай» у выяўленчай культуры Беларусі».

У творы «Балада пра апошнюю кулю» (1968) Віктар Грамыка закрануў тэму, якая выклікала даволі неадназначную рэакцыю ў тыя часы і да якой ён зноў звярнуўся праз два гады — у карціне «1941 год. Над Прыпяццю».

Трэба сказаць, што адлюстраванне пагібелі героя ўвогуле не вельмі віталася ў беларускім выяўленчым мастацтве да пэўнага часу. Возьмем, напрыклад, работы Яўгена Зайцава: калі «Пахаванне героя» (1945) яшчэ прымалася як прыклад распрацоўкі кананічнага для мастацтва сюжэта, то палатно «Стаяць насмерць» (1948), дзе па акопе сярод трупаў адзін баец цягне другога, які памірае ад ран, але ўсё яшчэ сціскае ў руцэ гранату, выклікала вялікія нараканні, можна сказаць, скандал. З цягам часу, аднак, было прызнана, што на карцінах пра вайну допушчальныя выявы смерці, што яны дазваляюць паказаць сапраўдны кошт мужнасці, гераізму воінаў. Але раней шыя табу разбураліся вельмі марудна. Прынамсі, прынята было лічыць, што ў мастацкім творы савецкі воін мусіць паміраць у атачэнні баявых таварышаў.

Зусім інакш вырашыў тэму смерці героя Віктар Грамыка ў сваім творы «1941 год. Над Прыпяццю». Напісаная ў 1970 годзе, гэтая карціна — адна з самых пазнавальных у творчай спадчыне народнага мастака Беларусі і адна з найбольш выбітных у беларускім жывапісным летапісе Вялікай Айчыннай вайны.

...Памерлага ад ран байца, які так і не выпусціў з рук вінтоўку, атачаюць не баявыя таварышы. Над воінам сядзіць пажылая жанчына. Нерухомая выпрастаная постаць, безнадзейна і пакорліва складзеныя рукі, пацямнелы ад гора твар з горка сцятымі вуснамі — яна нібыта скамянела ў роспачы. Старая сядзіць на каленях, і, калі пільна прыгледзецца, выява беларускай сялянкі і байца нагадвае сцэну П'еты. Побач — дзявочая фігурка. Дзяўчына-падлетак крычыць. Але гэта не жалобнае галашэнне. Рух складзеных



Віктар Аляксандравіч ГРАМЫКА. Аўтапартрэт. 1965—1966. Кардон, алей.

рук дзяўчыны паказвае, што яна кагосьці кліча. Яна адзіная на гэтай карціне ўся ў руху — яна ўвасабленне жыцця, надзеі, памкнення. Усё на гэтым палатне Віктара Грамыкі пабудавана на кантрастах: смерць і жыццё, нерухомасць і экспрэсія, сталасць і юнацтва, маўчанне і крык.

Хто гэтыя дзве жанчыны? Магчыма, маці і сястра забітага байца? Не, хутчэй, гэтыя вобразы — увасабленне ўсіх жанчын — мацярок, жонак, сёстраў, дачок, — якія незваротна страцілі на той вайне сваіх родных, каханых... Вайна на гэтым палатне — не геройства, не подзвігі і перамогі, а суцэльная трагедыя, смерць адных і пакуты іншых.

Каляровая гама палатна лаканічная, але вельмі выразная. Дамінуюць глыбокі чырвоны і жаўтавата-пясочны. Гэтыя колеры выклікаюць падсвядомае адчуванне неспакою, трывогі. Кантраснымі плямамі вылучаецца колер жалобы — чорны: хустка на галаве старой кабеты, сукенка дзяўчынкі, посцілка, на якой ляжыць баец, ды і неба над Прыпяццю, зацягнутае чорнымі хмарамі. Трое людзей, намаляваных на карціне, быццам самотнікі, закінутыя ў жоўтую пясчаную пустыню, па якой разліваецца бязмежная плынь крыві. Крывавая рака, выгінаючыся, падступае амаль да іх ног, нібыта пагражаючы іх паглынуць. Што могуць зрабіць гэтыя бездапаможныя жанчыны, перад якімі ляжыць той, хто загінуў, спрабуючы іх абараніць? Ім застаецца альбо скамянець, знерухомецць ад гора, альбо крычаць, спадзеючыся на выратаванне, заклікаючы да барацьбы.

Дасведчаныя людзі скажуць, што берагі Прыпяці сапраўды пакрытыя светлымі пяскамі, што яе воды ў некаторых месцах з прычыны асаблівасцяў тутэйшых глебаў афарбоўваюцца ў чырванаваты колер. Гэтыя дасведчаныя людзі зазначаць, што дзяўчына крычыць, каб выклікаць пераваз, які і дагэтуль з'яўляецца адзіным спосабам пераправіцца з аднаго берага ракі на другі. Але ўсе гэтыя рэаліі набываюць на карціне Віктара Грамыкі глыбокі сімвалічны сэнс.

Выявы на палатне вельмі лаканічныя, не дэталізаваныя. Таму адна-адзіная маленькая, але важная дэталь, на якой Грамыка ўсё ж ставіць акцэнт, асабліва кідаецца ў вочы і набывае выключны сэнс. На руцэ байца, якая сціскае вінтоўку, — нібыта заручальны пярсцёнак. Малады салдат адышоў у нябыт як герой, павянчаны са зброяй.

Што азначае назва карціны? Не так часта ў назве мастак ставіць кропку паміж двума складнікамі — гэта нібыта падказвае, што кожны з іх важны сам па сабе. 1941 год — таму што карціна адлюстроўвае настрой менавіта пачатку вайны, калі ў моры крыві, адчаю і, здавалася б, безвыходнасці людзям так цяжка, але так важна было захоўваць надзею. Чаму ж — «Над Прыпяццю»? Тут, відаць, варта звярнуцца да надзвычай цікавай гісторыі стварэння гэтай карціны і чаргговы раз пераканацца, якімі непрадказальнымі, пакручастымі бываюць шляхі творчага мыслення. Вось як пра гэта расказваў сам Віктар Грамыка: «Да гэтай карціны я ішоў доўга — больш за тры гады. Штуршок адбыўся нечакана: мы з прыяцелем плылі на маторцы па Прыпяці, і ў раёне Петрыкава, на адным з тых знакамітых агромністых жоўта-белых пляжаў, я заўважыў адзінокую фігуру жанчыны. Яна сядзела на пяску, побач ляжалі веласіпед і вялікі мех, праз радно якога праступалі рэбры боханаў фармавога чорнага хлеба. Чымсьці гэты вобраз так узрушыў мяне, што я даў знак таварышу павярнуць лодку, і мы яшчэ раз праплылі міма той адзінокай жанчыны. Твар яе быў напружаны і журботны. Яна, напэўна, чакала паравозу — і ніхто па ёй з таго боку не прыязджаў. Ёй жа трэба было перабірацца спачатку на лодцы, а потым на калёсах ехаць некалькі кіламетраў, бо супрацьлеглы бераг Прыпяці быў заліўны, і вёскі ад яго стаялі далёка.

Усё гэта неяк імгненна і востра адгукнулася ў душы, ажно сэрца сціснулася. Закруціліся ў галаве неакрэсленыя ідэі, звязаныя з вобразам гэтай жанчыны. Той хлеб у мяху арыентаваў быццам бы на сацыяльна-бытавую тэматыку, калі гаварыць пра жанр, — але з якім ухілам? Як вырашыць гэтую тэму? Я доўга круціў так і гэтак, з'яўлялася фігура дзяўчынкі, і тое, і сёе... Потым адкладваў: не мая мова, не мая тэма. Але аднойчы, пасля творчых пакут, прыйшло тое, што мастакі называюць азарэннем. Я ўбачыў яе, сваю карціну, але — зусім іншую. Гэта работа, што так доўга хавалася ад мяне ў тайніках падсвядомасці, раптам паўстала перад унутраным зрокам так дакладна, быццам я разглядаў рэпрадукцыю. Я ўбачыў, што падзея адбываецца ў сорак першым годзе. Я ўбачыў, што на пяску ляжыць смяротна паранены салдат, укрыты шынялём з пятліцамі пагранічніка. Ляжыць ён на посцілцы, нібы ў чоўне, які плыве ўжо ў нябыт ці, наадварот, у неўміручасць. Я ўбачыў і чорнае сярод белага дня неба, і крывава-чырвоную Прыпяць. І жоўта-белы пясок, і вербы, сагнутыя пад ветрам, і жанчыну з тварам, поўным смутку, і кволую дзяўчынку, якая кліча на дапамогу. Прычым азарэнне было імгненнае. Не паверыце, але карціна напісалася ўсяго за тры сеансы — за тры рабочыя дні. Верасьнёўскай раніцай — у пятніцу — я пачаў пісаць карціну. У нядзелю амаль завяршыў працу, у панядзелак толькі перапісаў светлую кофту жанчыны. У тыя далёкія часы я працаваў вельмі хутка, але ўсё роўна тэрмін выканання такой вялікай і досыць складанай карціны быў фантастычна кароткі. Пры гэтым лічу яе адной з тых, што найбольш цяжка далася, і — адной з самых удалых. У ёй праз вобразныя сродкі — не праз кроў! — сказана пра вайну вельмі многае».

Карціна «1941 год. Над Прыпяццю» мела вялікі поспех на Усесаюзнай выстаўцы 1970 года, не раз экспанавалася за межамі СССР. За гэтае палатно Віктар Грамыка быў узнагароджаны сярэбраным медалём імя Грэкава, які прысуджаецца найлепшым творам батальнага жывапісу. Сёння гэтая карціна экспануецца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь і працягвае ўражваць гледачоў.

У гэтым творы Віктара Грамыкі няма ні празмернага пафасу, ні недарэчнага штукарства. На першы погляд карціна вельмі «простая», мінімалістычная: усяго тры фігуры, усяго некалькі колераў. Але, напэўна, у гэтай «прастаце» і хаваецца сакрэт таго, што палатно выглядае так, быццам напісана сёння, а не амаль паўстагоддзя таму. Мінімальнымі выяўленчымі сродкамі мастак здолеў сказаць вялікую праўду пра вайну. Дый не толькі пра вайну, а ўвогуле пра жыццё і смерць, пра ўсё тое, пра што і мусіць казаць вялікае мастацтва.

**Юлія ЗАГОРСКАЯ,**
**старшы навуковы супрацоўнік аддзела сучаснага беларускага мастацтва Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь.**



Віктар Аляксандравіч ГРАМЫКА. Салдаты. 1967. Палатно, алей.



Віктар Аляксандравіч ГРАМЫКА. 1941 год. Над Прыпяццю. 1970. Палатно, алей, тэмпера.

## Міхаіл СЕМЯНЮК:

# «МІНУЛЫЯ ПЕРАМОГІ — НЕ ВЫПАДКОВАСЦЬ»

### Як камп'ютар замяніў дошку і навошта правяраць шашыстаў на допінг

**Міхаіл Семянюк — рэкардсмен адразу па некалькіх крытэрыях. Па-першае, ён стаў самым маладым гросмайстрам у краіне, атрымаўшы гэтае званне ў 17 гадоў, па-другое, сёння ён адзіны ў краіне, хто з'яўляецца гросмайстрам адразу па двух відах шашак — рускіх і міжнародных. Гэтым спортам, а тады яшчэ хутчэй проста забаўляльнай гульнёй, Міхаіл пачаў займацца ў пяцігадовым узросце ў дзіцячым садку, у школе хлопец ператварыў гульню ў сур'ёзнае захапленне, а потым і ў прафесійную дзейнасць. Пра тое, як яму ўдалося дасягнуць гучных поспехаў на міжнароднай арэне ў такім юным узросце, як выседзець за сталом больш за пяць гадзін і колькі здольны працаваць чалавечы мозг, міжнародны гросмайстар расказаў у інтэрв'ю.**

***— Міхаіл, як вам удалося дасягнуць такіх высокіх званняў адразу ў двух відах шашак?***

— Працэс выканання гросмайстра ў рускіх і міжнародных шашках адрозніваецца. У рускіх неабавязкова выйграваць нейкія турніры, галоўнае — набіраць ачкі і гуляць са знакамітымі сапернікамі, з гросмайстрамі. У канцы 2017 года я выканаў міжнароднага гросмайстра ў рускіх шашках, гэта больш папулярны від у нашай краіне, ды і ў прынцыпе ў СНД. Для гэтага мне спатрэбілася двойчы выканаць нарматыў на Кубку свету і на чэмпіянаце свету, дзе я заняў тады 12-е месца. У міжнародныя шашкі гуляў заўсёды, але асаблівых дасягненняў не было, першая буйная перамога здарылася летам 2018 года: я выйграў чэмпіянат Еўропы сярод юніёраў да 19 гадоў. Гэта было даволі нечакана, ніхто не верыў у мяне, таму што ў нас спартсмены даволі рэдка паказваюць вынікі ў гэтым відзе, у асноўным толькі дзеці. Потым я паехаў на чэмпіянат свету сярод юніёраў і там таксама выйграў, узніклі нават некаторыя спрэчкі, што зрабіў я гэта несумленна з-за таго, што рэйтынг у мяне быў нізкі, а ў канкурэнта, якога я абагнаў, — высокі. Напэўна, такое здарылася ўпершыню.

***— Што дае вам званне гросмайстра?***

— У прафесійным плане абсалютна нічога, мне ў прынцыпе на гэтыя званні ўсё роўна.

***— Пераход у дарослыя турніры аказаўся адчувальным?***

— Я вельмі даўно пачаў гуляць з дарослымі, таму пацішу прывык. Прытым мне гэта больш падабалася асабліва ў рускіх шашках, таму што на дзіцячым узроўні няма жараб'ёўкі пачатковай пазіцыі, а гэта, хутчэй за ўсё, нічыя. Таму на Кубкі свету я пачаў ездзіць з 14 гадоў.

***— Якія яшчэ тытулы вам хацелася б выйграць?***

— Наогул, я не загадваю. Перамога на чэмпіянаце Еўропы дала мне магчымасць выступіць на чэмпіянаце свету ў верасні, а цяпер згуляць на сур'ёзным міжнародным турніры ў Кітаі, хацелася б паказаць, што я здольны на многае, бо некаторыя лічаць, маўляў, мінулыя перамогі — гэта выпадковасць.



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

***— Шашкамі можна зарабляць на жыццё?***

— Ганарары ў нас невялікія. Турніры Кубка свету дзеліцца на зоркі, дык вось прызывы фонд пяцізоркавага турніру складае каля 10 тысяч долараў, але такія спаборніцтвы праходзяць толькі пару разоў на год. У шахматах ганарары значна вышэйшыя, хоць гэтыя віды спорту даволі падобныя.

***— Развіццё камп'ютарных тэхналогій мяняе ваш від спорту?***

— Напэўна, хоць складана сказаць, што змяніўся ўзровень гульні. З'явілася ўдакладненне многіх пазіцый, варыянтаў, гэта, вядома, вельмі дапамагае расці, але мала хто гэтым карыстаецца. Як кажа мой трэнер, раней з'яўляўся часопіс у кіёсках, і ўсе адразу беглі яго купляць. Хто не паспеў, той чакаў наступнага, каб паглядзець нейкія камбінацыі. Цяпер ніхто не купляе кнігі, праграмамі таксама мала хто карыстаецца.

***— Вашы трэніроўкі сёння праходзяць на дошцы або за камп'ютарам?***

— За камп'ютарам, а калі нават і без яго, то з раздрукаванымі камбінацыямі з розных праграм.

***— Як часта неабходна трэніравацца шашыстам?***

— У будныя дні я звычайна гуляю ў стаклетачныя шашкі, а ў суботу хаджу на рускія. Заняткі доўжацца не больш за дзве гадзіны, таму што далей мозг перастае працаваць і ў трэніроўцы няма сэнсу.

***— Якія якасці важныя для шашыстаў?***

— Самае галоўнае — цягавітасць. У рускіх шашках гэта не так прыкметна, таму што партыя доўжыцца значна менш, чым у стаклетачных. Два туры там ты можаш згуляць гадзіны за 4 максімум, а вось у стаклетачных адну партыю гуляеш гадзіны 4—5. На чэмпіянаце Еўропы ў нас адбываліся сітуацыі, калі было два туры ў дзень, гэта значыць, ты гуляў 8—9 гадзін. Гэта цяжка. Можа быць, мне з-за гэтага і пашанцавала, я больш малады і мог выседзець больш. Хоць нам, вядома, можна ўставаць, хадзіць, піць ваду падчас партыі, але гэта ўсё роўна складана.

***— Нядаўна амерыканскую гімнастку выкрылі ва ўжыванні прэпаратаў, якія спрыяюць канцэнтрацыі ўвагі. У вашым відзе спорту былі выпадкі, калі спартсмены звярталіся да падобных дапаможных рэчываў?***

— Не чуў пра гэта, я дакладна нічога такога не п'ю. У нас таксама ёсць праверка на допінг, але асабіста я ніколі не праходзіў гэтую працэдуру. Наогул, гэта цікава, трэба даведацца (*смяецца*).

***— Ваш трэнер неяк казаў, што за партыю шашыст можа страціць да кілаграма вагі, з чым гэта звязана?***

— Напэўна, з нервамі. Але я стараюся ніколі не паказваць сваіх эмоцый.

***— Вядома, што ў шашкі гулялі такія вялікія палкаводцы, як Сувораў і Напалеон. Гэтая гульня развівае разумовыя здольнасці ў іншых сферах жыцця?***

— Па ідэі павінна развіваць, напрыклад, нейкія аналітычныя навыкі, але па сабе, шчыра скажу, я гэтага не заўважаў. У школе не надта займаўся вучобай, якія адзнакі выходзілі, такія і атрымліваў, прагульваў, 10-ы клас наогул ледзь скончыў (*усміхаецца*).

***— У вас ёсць нейкія асаблівасці ў падрыхтоўцы да гульні?***

— Падчас турніру, так. Гляджу партыі, абмяркоўваю іх з трэнерам, але галоўнае — настроіцца псіхалагічна.

***— Харчаванне мае значэнне або падсілкоўванне мозга шакаладам — гэта толькі стэрэатып?***

— Не думаю, што ёсць нейкая залежнасць паміж тым, што ты ясі, і вынікам партыі, але вось на нядаўнім турніры паміж гульнямі з сур'ёзнымі сапернікамі, я вырашыў паесці. І так шчыльна гэта зрабіў, што да пачатку партыі проста засынаў, потым мяне скаланула ад нечаканасці, што сапернік штосьці мне падстроіў. Прачнуўся, але зразумеў, што больш так есці перад партыяй не буду.

***— Шашкі — непапулярны від спорту ў моладзі, як рэагуюць аднагодкі на ваш род дзейнасці?***

— Некаторыя кажуць, маўляў, не ведалі пра тое, што ёсць яшчэ і спаборніцтвы па шашках, што наогул гэта лічыцца спортам. Многія ведаюць гэтую гульню проста як спосаб правядзення вольнага часу ў коле сям'і.

***— Каб быць паспяховым шашыстам, трэба мець азарт?***

— Так. Гэта, напэўна, і прыводзіць да поспеху: ты ўвесь час хочаш гуляць, гуляць, гуляць і перамагаць.

***— У іншыя азартныя гульні гуляеце?***

— Шахматы люблю, гляджу нават некаторыя партыі.

***— Цяпер атрымліваеце адукацыю ў БДУФК, лёгка гэта даецца?***

— Я вучуся на кафедры лячэбнай фізкультуры, хацеў выбраць менавіта гэты кірунак. Пакуль усё вельмі падабаецца, у тым ліку і тое, што там ёсць фізічная нагрузка: бегаем, скачам цераз бар'еры, іншы раз гэтага не хапае ў падрыхтоўцы шашыстаў.

## АБЯЦАНАМУ — БЫЦЬ!

### У Мінску ўпершыню пройдзе забег абяцанняў

**20 красавіка ў парку Перамогі пройдзе забег «Я абяцаю!», прысвечаны выкананню абяцанняў самім сабе. Арганізатары адзначаюць, што ў мерапрыемстве змогуць прыняць удзел нават тыя, хто далёкі ад спорту і ніколі не бегаў, бо траса пачынаецца з сімвалічных паўтара кіламетра. Для больш упэўненых у сваіх сілах аматараў спорту ёсць варыянты трасы на 3, 5, 10 або 15 км.**

— Кожны бягун зможа даць сабе абяцанне або паставіць мэту — на год, на сезон, на жыццё, якую запіша на сваім стартавым нумары, і гэта стане пунктам А, пачаткам — адкуль пачнецца рух у бок дасягнення, — расказваюць **арганізатары забегу Вадзім СІМАНАЎ і Максім МАЛЧАНАЎ.** — Таксама адна з мэт забегу — дапамагчы сабраць сродкі на лячэнне падапечных фонду «Шанц» з анкалагічнымі захворваннямі.

Арганізатары прадугледзелі месцы для пераадзявання і захоўвання рэчаў на час забегу, першую медыцынскую дапамогу, пітную ваду. Кожнаму бегуну будзе прысвоены іменны нумар, а для ўдзельнікаў забегу на 5—15 км будзе выдадзены электронны хранаметраж (таймінг).

Пераможцы забегу атрымаюць каштоўныя падарункі. І абсалютна ўсе фінішоры стануць уладальнікамі прыгожых металічных медалёў і віншавальных паштовак напярэдадні Вялікадня. Старт прызначаны на 11 раніцы, каб прыняць удзел у забегу, неабходна зарэгістравацца (improve.by/2019-ya-obeshhayu).

## ДА АЛІМПІЙСКІХ ВЯРШЫНЯЎ

**У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязды» расказваем пра найбольш актуальныя падзеі выхадных.**

***1. Генадзь Лапцеў (вагавая катэгорыя 61 кг) заваяваў залатую ўзнагароду на чэмпіянаце Еўропы па цяжкай атлетыцы ў Батумі (Грузія).*** У суме двухбор'я (рывок і штуршок) ён паказаў найлепшы вынік на кантынентальным форуме — 286 кг (133 + 153), гэта новы рэкорд Беларусі.



Аляксандр Лукашэнка павіншаваў члена нацыянальнай каманды з пераканаўчай перамогай на чэмпіянаце Еўропы. *«Ты ўпершыню выйшаў на памост дарослых спаборніцтваў кантынентальнага першынства і адразу ж паказаў высокі ўзровень спартыўнага майстэрства. Няхай гэты яркі дэбют натхняе цябе і стане першай прыступкай на шляху да алімпійскіх вяршыняў!»* — гаворыцца ў віншаванні. Кіраўнік дзяржавы таксама пажадаў спартсмену і ўсёй нацыянальнай камандзе па цяжкай атлетыцы моцнага здароўя, поспеху і новых здзяйсненняў.

Раней Юлія Асаёнак (45 кг) заваявала бронзавую ўзнагароду ў двухбор'і, за крок ад п'едэстала спынілася Людміла Псышчаніца (55 кг), якая ў суме двухбор'я набрала 187 кг (82 + 105).

На кантынентальным форуме спаборнічаюць больш за 400 атлетаў з 47 краін. Гэты турнір носіць статус ліцэнзійнага, яго ўдзельнікі заваёўваюць ачкі, неабходныя для выступлення на Алімпійскіх гульнях у Токіа ў 2020 годзе. Завершыцца чэмпіянат Еўропы 13 красавіка.

***2. Вікторыя Азаранка не змагла з-за траўмы завяршыць фінальны матч турніру ў мексіканскім Мантэрэі з прызавым фондам 250 тысяч долараў.*** У вырашальным паядынку Вікторыя прайграла першую партыю іспанцы Гарбін'е Мугурузе 1:6, а ў другім сэце пры ліку 1:3 беларуска не змагла працягнуць гульню з-за пашкоджання нагі.



Нагадаем, да гэтага на спаборніцтвах у Мантэрэі Азаранка абыграла японку Мію Ката — 6:4, 6:2, казахстанскую тэнісістку Зарыну Дыяс — 6:3, 6:2, расіянку Анастасію Паўлючэнкаву — 6:0, 6:4 і пятую ракетку свету немку Ангеліку Кербер — 6:4, 4:6, 6:1.

У абноўленым рэйтынгу ВТА па-ранейшаму лідзіруе японка Наомі Осака. Арына Сабаленка захавала 10-ю пазіцыю, Аляксандра Сасновіч 35-я, Вікторыя Азаранка, дзякуючы выхаду ў фінал у Мантэрэі, паднялася на 60-е месца, Вера Лапко размясцілася на 65-й пазіцыі.

***3. Іспанскі спецыяліст Манола Кадэнас пакінуў пасаду галоўнага трэнера Брэсцкага гандбольнага клуба імя Мяшкова.*** У інфармацыі, размешчанай на афіцыйным сайце БГК, гаворыцца, што кіраўніцтва клуба падтрымала просьбу Манола Кадэнаса аб датэрміновым скасаванні кантракта ў сувязі з яго рашэннем засяродзіцца на рабоце з нацыянальнай зборнай Аргенціны. Выконваючым абавязкі галоўнага трэнера БГК імя Мяшкова прызначаны іспанец Рауль Алонса, які быў адным з асістэнтаў Манола Кадэнаса.

Нагадаем, Кадэнас узначаліў брэсцкую каманду летам 2018 года. Пад яго кіраўніцтвам БГК выйшаў у 1/8 фіналу Лігі чэмпіёнаў, стаў чэмпіёнам Беларусі і заняў 3-е месца ў SEHA-лізе.

***4. Згуляныя ўсе матчы 2-га тура ў элітным дывізіёне чэмпіянату краіны па футболе.*** Гульцы футбольнага клуба «Мінск» згулялі ўнічыю з «Дынама-Мінск» — 0:0, «Гарадзея» і «Віцебск» таксама не выявілі пераможцу — 1:1, РЦАР-БДУ буйна саступіла БАТЭ — 0:4, а «Слуцк» «Гомелю» — 0:6, «Нёман» саступіў «Шахцёру» — 0:3, «Тарпеда-Мінск» перайграў «Ісłач» — 1:0, «Славія» саступіла «Тарпеда-БелАЗ» — 1:2, «Дынама-Брэст» — «Дняпро» — 3:1.

**Матэрыялы падрыхтавала Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению Гомельского филиала РУП «Белтаможсервис» (продавец права/арендодатель) извещает о проведении 25 апреля 2019 года открытого повторного аукциона по продаже права на заключение договора аренды недвижимого имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

| № лота | Наименование лотов | Адрес лота | Начальная цена продажи, бел. руб., с учетом НДС (20 %) | Сумма задатка, бел. руб., с учетом НДС (20 %) |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **Кабинет общей площадью 15,9 кв. м**, расположенный на 2-м этаже в складском и административном здании с инв. № 350/С–37807. Коэффициент спроса – 3,0. Базовая ставка – 0,3. Коэффициент местоположения – 0,7. Срок договора аренды – 3 года. Цель использования: **для офисного помещения.** Размер арендной платы в месяц – **161,42** бел. руб. (с учетом НДС 20 %) | г. Гомель, ул. Борисенко, 5 | **64,04** | 3,20 |
| 2 | **Кабинет общей площадью 11,4 кв. м**, расположенный на 2-м этаже в складском и административном здании с инв. № 350/С–37807. Коэффициент спроса – 3,0. Базовая ставка – 0,3. Коэффициент местоположения – 0,7. Срок договора аренды – 3 года. Цель использования: **для офисного помещения.** Размер арендной платы в месяц – **115,67** бел. руб. (с учетом НДС 20 %) | | **45,91** | 2,30 |

| | |
|---|---|
| Сведения о балансодержателе | Гомельский филиал РУП «Белтаможсервис», г. Гомель, ул. Борисенко, 5, контактный тел. 8 (0232) 49-20-67 – Лисовская Алла Николаевна |
| Срок подачи заявления | **с 09.04.2019 г. по 23.04.2019 г.** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга». **Подача документов по почте не допускается** |
| Номер р/с для перечисления задатка | BY50AKBB30120878500143000000 в филиале № 300 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY21300, УНП 101561144, **получатель – Гомельский филиал РУП «Белтаможсервис»,** назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах (с указанием лота), задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления |
| Размер штрафа | Лоты №№ 1–2 (две) базовых величины, лоты №№ 2–1(одна) базовая величина, согласно Указу Президента РБ 10.01.2013 г. № 14 «Об определении размера штрафа в случае отказа или уклонения участника, выигравшего торги от условий проведения аукционных торгов, согласно действующему законодательству» |

**Шаг аукционных торгов – 10 (десять) %. К участию допускаются только индивидуальные предприниматели или юридические лица. Для участия в аукционе прилагаются к заявлению:** копия платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя; юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; представителем юридического лица или индивидуального предпринимателя – оригинал доверенности (документ, подтверждающий, полномочия должностного лица). При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия. При заключении договоров аренды ставка арендной платы может быть скорректирована с учетом обязательности применения в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 29.03.2012 г. № 150 понижающих или повышающих коэффициентов в зависимости от вида деятельности, осуществляемой на арендуемых площадях, и категории арендатора. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение **3 (трех) рабочих дней** со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на текущий (расчетный) счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола. С участником, ставшим победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона), в течение **30 (тридцати) календарных дней** после проведения аукциона и подписания протокола будут заключены договоры аренды недвижимого имущества. Аукцион проводится в соответствии с Положением «О порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения. Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 23.02.2019 г. № 37 (28904). **Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56. Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора торгов – gomeloblreklama.by. в разделе «Аукционы»**

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельоблстрой» (продавец), в лице антикризисного управляющего в деле о банкротстве Колеснева Н. М. извещает о проведении 25 апреля 2019 года открытого повторного аукциона со снижением начальной цены на 25 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, без учета НДС (20 %), бел. руб. | Шаг аукциона – 5 %, бел. руб. | Сумма задатка, без учета НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| **Условие продажи: 1.** Претендент на покупку (победитель) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние. **2.** Действия по снятию с регистрационного учета транспортных средств, а также в случае необходимости получения регистрационных документов (при их отсутствии у Продавца) производится Покупателем на основании выданной доверенности Продавцом, за его счет и его силами. Переоформление документов на автотехнику и механизмы производится за счет покупателя. **3.** Земельный участок под объект продажи **(лоты № 3, 4, 7, 8)** будет выделен по заявке нового собственника, согласно законодательству РБ (предварительная схема пользования земельного участка под объекты продаж прилагается). **Примечание:** в соответствии с действующим Законодательством РБ (в части изменения подпункта 2.30 пункта 2 статьи 115 в Налоговом кодексе РБ с 1 января 2019 года) **реализация имущества осуществляется без учета НДС 20 %** | | | | |
| 1 | **Капитальное строение с инв. № 330/С-31295** общей площадью **2 926,7** кв. м, назначение – здание общежития, наименование – **общежитие. Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, Лукский с/с, аг. Лукский, ул. Зеленая,11. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **321882806101000145** общей площадью **0,0935 га (право аренды). Целевое назначение земельного участка:** для содержания и обслуживания общежития № 1 (для размещения объектов многоквартирной жилой застройки) | **426 300,00** | 21 315,00 | 42 630,00 |
| 2 | **Капитальное строение с инв. № 330/С-19116** общей площадью **745,4 кв. м,** назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, наименование – **здание столярной мастерской (пилорама). Адрес:** Гомельская обл., Кормянский р-н, г. п. Корма, ул. Рогачевская, 21А. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **322555100001001858** общей площадью **0,4810 га (право постоянного пользования). Целевое назначение земельного участка:** для обслуживания здания столярной мастерской (пилорамы). **В состав лота № 2 входит:** шкаф РУ-1(инв. № 156), шкаф КТП-05-03 (инв. № 157), электрощит ЩО-7(инв. № 171), электрощит ТДМ электрик (инв. № 169), трансформатор ТК-20 (инв. № 174), трансформатор ТК-20(инв. № 175), трансформатор Т-0,66 (инв. № 176), ленточный станок MG6500 куб. м (инв. № 839), станок многопильный ЦМ-150 (К)(инв. № 840), циклон (инв. № 19), лесопильная рама р-63 (инв. № 371-1) | **55 059,00** | 2 752,95 | 5 505,90 |
| **Местонахождение лотов №№ 3–9:** Гомельская обл., Кормянский р-н, г. п. Корма, ул. Рогачевская, 21. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **322555100001001373** общей площадью **6,7272 га (право постоянного пользования). Целевое назначение земельного участка:** для размещения производственной базы | | | | |
